№№53–54
(2781–2782)

10 красавіка 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

СУД

«Са свайго боку я зраблю ўсё ад мяне залежнае, каб зруйнаваць гэты рэжым»

У аўторак адбыўся суд над сябрам незарэгістраванага "Маладога фронту" Кацяй Салаўёвай. Згодна з прыгаворам, Кацярына Салаўёва прызнана вінаватай у дзеянні ад імя незарэгістраванай арганізацыі і аштрафавана на 1 мільён 750 тысяч рублёў.

З самага ранку ўваход у будынак суда быў заблакіраваны супрацоўнікамі міліцыі і людзьмі ў цывільным. Міліцыянты паведамілі, што ўсе ахвочыя змогуць трапіць у залу суда перад самым пачаткам пасяджэння. Пазней высветлілася, што жадаючых падтрымаць больш, чым месцаў у зале. "Суддзя шукае большую залу, пасяджэнне пачнецца крыху пазней", -- напачатку запэўнівалі прысутных міліцыянты. Аказалася, што яны папросту хлусілі. Пасяджэнне распачалося ў час, а ў маленькую залу спачатку не змаглі трапіць нават бацькі Кацярыны Салаўёвай. Праўда, потым становішча было выпраўлена. Асабіста намеснік старшыні суда падчас судовага працэсу завёў у залу бацькоў Кацярыны разам з першым сакратаром амбасады ЗША Луісам Крышакам... А ўсім астатнім сказалі, што яны змогуць трапіць на судовае разбіральніцтва толькі падчас перапынку.

Справу ў дачыненні да Кацярыны Салаўёвай разглядала суддзя Марозава. Абараняў Кацярыну адвакат Аляксандр Галіеў.

Працэс распачаўся з допыту сведкаў, у якасці якіх выступалі дзяўчаты-студэнткі, што жылі з Салаўёвай у адным інтэрнаце. Суд, у прыватнасці, цікавіла, ці ведаюць сведкі аб тым, што "Малады фронт" -- незарэгістраваная і, больш за тое, апазіцыйная арганізацыя...

Як і чакалася, падсудная Салаўёва прызнала, што з'яўляецца сябрам незарэгістраванага ў Беларусі "Маладога фронту", што ўступіла ў арганізацыю свядома, з мэтай адраджэння беларускай мовы і культуры. Яна паведаміла суду і матывы свайго ўчынку, заявіўшы, што пры гэтай уладзе беларуская мова можа пераўтварыцца ў латынь...

Сярод пісьмовых матэрыялаў справы, якія агучваліся ў судзе, можна вылучыць дзённікавыя запісы Кацярыны Салаўёвай, дзе запісана: "Са свайго боку я зраблю ўсё ад мяне залежнае, каб зруйнаваць гэты рэжым". Гэтая цытата была далучана да матэрыялаў крымінальнай справы...

Увогуле судовы працэс над Кацярынай Салаўёвай аказаўся даволі хуткім. Справа была разгледжана літаральна за тры гадзіны. У судовых спрэчках абарона Салаўёвай настойвала на поўным яе апраўданні, а дзяржаўны абвінаваўца спадарыня Коласава прасіла суд прызнаць Салаўёву вінаватай і прызначыць ёй штраф у памеры 200 базавых велічынь (7 мільёнаў рублёў).

Увечары таго ж дня суддзя Марозава прызнала Кацярыну Салаўёву вінаватай і пакарала штрафам у памеры 50 базавых велічынь. Гэта 1 мільён 750 тысяч рублёў.

Віталь ГАРБУЗАЎ.

ЯК ГЭТА БЫЛО...

Франак ВЯЧОРКА:
«А намесніца дэкана запытала, што азначаюць мае партрэты ў жаночых прыбіральнях...»

Моладзёжны актывіст Франак ВЯЧОРКА, не так даўно адлічаны з факультэта журналістыкі БДУ быццам бы за непаспяховасць, вырашыў зараз ізноў прайсці на родным факультэце сумоўе. Што з гэтага атрымалася?

— Паўторна паступаць на журфак я не збіраюся ні ў якім разе, бо гэта прынцыпова. Калі я і працягну там вучобу, то толькі праз аднаўленне. Дарэчы, 5 красавіка я падаў у суд на рэктара БДУ. А сумоўе — гэта было такім ходам, контратакай... Запісаўся на яго ў першы ж дзень рэгістрацыі, на пачатку сакавіка, запісаўся на спецыяльнасці "журналістыка" і "міжнародная журналістыка", каб выпрабаваць нервы камісіі. Бо ніякія рэкамендацыі, якія выдаюцца на сумоўі, у прынцыпе, нічога не значаць.

— Тэст на лаяльнасць?

— Так. Праходзіла сумоўе ў цэнтральным корпусе БДУ, у камісіі было шэсць чалавек. Старшыня камісіі — Таццяна Дасаева, у камісіі — дэкан факультэта Сяргей Валянцінавіч Дубовік, супрацоўнік упраўлення інфармацыі Матусевіч (не ведаю, як яго завуць), іншыя выкладчыкі. Да мяне было стаўленне не як да абітурыента, а больш як да студэнта. Першае, што ў мяне спытаўся Дубовік, дык гэта навошта я прыйшоў на сумоўе. Я адказаў, што збіраюся аднаўляцца і рэкамендацыя мне паслужыць аргументам пры аднаўленні. У камісіі захіхікалі, а пытанні працягнуліся. Матусевіч запытаў: "Якія законы рэгулююць права рэдакцыі адмовіць у публікацыі таго ці іншага матэрыялу?" Адказаў, што такое права рэгулюецца ўнутраным статутам рэдакцыі і Законам аб друку і СМІ. Пасля ўзяліся за мой інтэрнет-дзённік. Аказваецца, што ўсе ў камісіі вельмі дасведчаныя і ва ўсіх ёсць раздрукоўкі майго дзённіка. Нават цытавалі падчас сумоўя і дадавалі: "Ці адпавядае тое, што ты пішаш у інтэрнеце, сацыяльнай адказнасці журналіста? Чаму падаеш усё аднабакова? Чаму абражаеш факультэт?" Я растлумачыў, што нікога не абражаў, а выказваўся пра сваё адлічэнне, якое палічыў незаконным. Ізноў пасля гэтага смех... Пасля ў мяне яшчэ пацікавіліся, якое я маю дачыненне да журналістыкі, на што адказаў: "Я супрацоўнічаю два гады з інфармацыйным агенцтвам БелаПАН, друкуюся ў інтэрнет-выданнях, выдаваў газету ў ліцэі..." Мне было вельмі непрыемна адказваць на ўсе гэтыя пытанні, бо было бачна, што камісія запраграмавана на вынік. Калі я адказваў пра сацыяльную адказнасць журналіста і пра свой дзённік, мяне перапыніла адна выкладчыца з камісіі і сказала: "Вы так умно все говорите, но у меня сложилось впечатление, что вы давите на коммиссию". Я тады падумаў: можа, лепш маўчаць? І які сэнс гэтага сумоўя? Адным словам, сумоўе працягвалася хвілін пятнаццаць, пасля чаго мяне папрасілі выйсці.

— Каб прыняць рашэнне?

— Натуральна. Праз нейкі час мне паведамілі, што камісія параілася і вырашыла рэкамендацыю мне не даваць. Самае цікавае, што калі я зайшоў на факультэт, то ўжо адразу стала ясна, як гэта ўсё будзе адбывацца. А пасля сумоўя дэкан сказаў: "Бачыш, Франак, мы з табой сёння па-добраму і, спадзяюся, што наша гэтая сустрэча не выйдзе па-за межы аўдыторыі". Але, думаю, нічога страшнага не будзе, калі людзі даведаюцца, як у нас праходзяць сумоўі. Дарэчы, яшчэ адзін такі невялікі факт. Перад сумоўем я спаткаў намесніцу дэкана, і яна запытала ў мяне: "Што значаць вашыя партрэты ў жаночых прыбіральнях?" "Нічога не значаць, — кажу. — Нехта павесіў — і вісяць". Разумееце, гэта было б смешна, калі б не было так сумна. Бо ўся сістэма адукацыі паказала, што яна не вучыць, а гняце. І проста цкуе альтэрнатыўнае меркаванне. Калі я чакаў свайго выкліку на сумоўе, размаўляў з тымі хлопцамі і дзяўчатамі, якія прыехалі сумовіцца. Усе яны так прыхарошваліся, што складвалася ўражанне, што тут не змаганне ведаў, а канкурэнцыя іміджу. Так падначаленыя стараюцца спадабацца начальству. Прыхарошваліся, рыхтавалі выказванні пра БРСМ... Гэта ўсё настолькі смешна, што ад гэтага мне проста брыдка.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Юрый Бандажэўскі стварае цэнтр у Літве

Прафесар Юрый Бандажэўскі стварае міжнародны цэнтр праблем экалогіі і радыяцыйнай бяспекі чалавека.

Дзейнасць цэнтра будзе накіравана на вывучэнне стану здароўя і аказанне дапамогі людзям, якія жывуць на тэрыторыі Беларусі і краін Балтыі.

ШЧЫРА

Яна — голас народа

На маю думку, "Народная воля" не адносіцца ні да дзяржаўных, ні да апазіцыйных выданняў. Яна — голас народа, моцны голас, які павінен пачуць кожны сумленны грамадзянін нашай краіны.

Янка ПАЛЫН.

Мінск.

КАМЕРТОН

от Сергея Ваганова

Пляс на крови

12 марта 2008 года умер последний французский солдат Первой мировой войны Ладзаро Понтичелли. Ему было 110 лет.

В декабре 1915 года Гийом Аполлинер написал, а в ноябре 1917 года опубликовал стихотворение со странным названием — "Чудо войны". "Как ракеты красивы, когда они ночь озаряют!.. И нужно так много огня, чтоб изжарить людские тела!.."

9 ноября 1918 года Аполлинер умер от гриппа. Ему было 38 лет. На войне он получил тяжелое ранение головы.

...Ладзаро Понтичелли долго отказывался от предложения устроить ему похороны национально-государственного масштаба. Он говорил, что "это будет оскорблением для жертв Первой мировой, которые не были удостоены такой чести". Потом согласился — "во имя всех женщин и мужчин, погибших в Первой мировой войне".

Это была действительно национальная церемония: приспущенные по всей стране государственные флаги, минута молчания во всех госучреждениях, месса в соборе Сен-Луи Дома Инвалидов с участием двух президентов — бывшего и нынешнего, всех членов правительства и даже министра обороны Италии, потому что гражданин Франции Ладзаро Понтичелли был итальянцем…

Все это может показаться не очень актуальным на фоне текущих белорусских дел и проблем.

Но я не уверен, что через какое-то количество лет мы будем так же прощаться с последним белорусским солдатом Второй мировой.

Говоря "так же", я имею в виду прощание не только с последним солдатом, но и с войной как источником патриотических чувств.

С демонстрацией такого рода патриотизма мы продолжаем сталкиваться на каждом шагу. Даже Хатынь, даже Хатынь неуловимым переводом нравственных стрелок становится поводом для какой-то мазохистской гордости — у кого-де еще было такое? Я уж не говорю про "линию Сталина", парады, милитаристскую риторику и, конечно, без конца и меры пальбу и кровь с телеэкранов… Помню, как на юбилейном вечере одной газеты молодые танцоры в камуфляже и с бутафорскими автоматами изображали пляшущий спецназ. А после спецназа — стриптиз…

Впереди, конечно, Россия с ее безудержным подъемом патриотического духа. Но и мы не отстаем, все российско-патриотическое продолжаем числить до боли родным, пыжимся, как будто до сих пор простираемся "от Буга до Курил".

Историческая напыщенность, в общем, свойственна любому государству, большому особенно. Но когда видишь, как ветераны американских войн задают тон антивоенным демонстрациям, бросают к подножию Капитолия свои награды за Вьетнам, а сейчас и за Ирак, начинаешь понимать, что для того государства и его граждан война — всегда зло. Даже если политики считают войну неизбежной, отношение к ней и у политиков, и у граждан — как к неизбежному злу…

Мне случилось быть в Вашингтоне в Музее американской истории. Там полно школьников — свободно, без экскурсий и понуждений, они гуляют по залам, познают историю Америки, военную в том числе. Представить их в качестве субъектов "военно-патриотического воспитания" невозможно. Подозреваю, что такого словосочетания нет нигде в цивилизованном мире — настолько очевидно безумие попыток воспитывать патриотов на самоубийстве человечества…

Справедливо, наверно, будет спросить: на чем же тогда воспитывать патриотов?

Не будучи специалистом по воспитанию патриотов, я, честно говоря, не знаю, как ответить на этот вопрос. Мне просто кажется, что нельзя пускаться в пляс на крови.

Мне кажется, что воспитание патриотов не может быть составной частью идеологии и уж тем более предметом в учебных программах.

Мне кажется, что, разбивая кирпичи о головы, патриотов не воспитаешь.

Мне вообще кажется, что любить родину и любить государство — чувства и понятия разные. Они, конечно, могут сосуществовать в одном человеке, но только тогда, когда государство за все свои прегрешения перед гражданами испытывает чувство вины. Вот почему мне кажется, что последнее "прости" Франции своему солдату надо понимать буквально — ПРОСТИ!

Доживем ли мы до того момента, когда наше государство сподобится попросить прощения у своих граждан за войны, репрессии, нищету и беспамятство? Изображать из себя "Советский Союз" легче, чем отвечать за все содеянное им зло. В том числе зло по отношению к народной трагедии, которая называется Первой мировой войной.

Не знаю, до каких лет доживет последний белорусский ветеран Второй мировой. Не знаю, кто скажет и скажет ли ему последнее "прости", какой флаг склонится над его могилой, какой памятью о нем будет жить народившийся к тому времени народ и воздвигнет ли он, наконец, Спас на крови поколений.

Впрочем, ждать осталось не так уж долго.

kamerton_41@mail.ru

ПОЗИЦИЯ

Госпожа Ермошина знает, что делать, а вот у оппозиции, по-моему, нет четкого плана

ОБ АВТОРЕ

ИГНАТЕНКО
Олег Михайлович

Родился в г.Гомеле 17 августа 1952 года.

После средней школы окончил политехнический техникум.

Срочную службу на рядовых и сержантских должностях проходил в Прикарпатье.

В 1978 году закончил Институт народного хозяйства им.В.Куйбышева в г.Минске. Специальность — экономист.

20 лет служил на офицерских должностях в СА и Вооруженных силах Беларуси. В звании "подполковник" по сокращению штатов ушел в запас.

Служил в КБВО, ГСВГ, участник войны в Афганистане, участвовал в ликвидации последствий на ЧАЭС. Имеет государственные награды.

Был народным депутатом и председателем Временной комиссии по льготам и привилегиям Минского областного Совета (1990—1995 гг.).

Работал в Контрольной палате РБ, до 29 апреля 1996 года — в Службе контроля Администрации президента РБ, в различных коммерческих структурах, руководителем аналитического центра Минского завода колесных тягачей.

Из службы контроля Администрации президента был уволен (как председатель комиссии) за... направление материалов ревизии Генеральному прокурору с требованием возмещения нанесенного государству ущерба.

Является членом Международного общественного объединения им.Геннадия Карпенко.

Женат, имеет двоих сыновей и внучку.

Перед предстоящими у нас парламентскими выборами Запад и белорусская оппозиция продолжают настаивать на демократизации законов о волеизъявлении трудящихся, а председатель Центральной комиссии по выборам и проведению республиканских референдумов Лидия Ермошина твердо уверена, что *"отсутствует сам предмет для обсуждения"*. При этом ей хорошо известно, что либерализация избирательного законодательства — это одно из 12 условий, при выполнении которых западные страны согласны улучшить отношения с нынешней властью. Конечно, режиму хотелось бы улучшить эти отношения, но не за счет же создания равных условий всем участникам выборного процесса. Не так давно председатель Центризбиркома, не моргнув глазом, сетовала по тому поводу, что ОБСЕ *"предлагает так много, и постоянно эти предложения меняются, что трудно сказать, где их истинные предложения"*.

И все-таки, какие же эти основные, *"постоянно меняющиеся"* предложения Запада?

— Уважать право народа Беларуси выбирать своих лидеров демократическим путем.

— Уважать право народа Беларуси на независимую информацию и свободу высказываний.

— Уважать права негосударственных организаций.

— Освободить всех политических заключенных.

— Обеспечить право белорусов на независимую и непредвзятую судебную систему и т.д.

Перечисленные и не перечисленные выше предложения не являются какими-то чрезмерными, более того, они все прописаны ныне действующей Конституцией страны.

Но поскольку власть имущие не обращают на это внимания и не хотят даже вспоминать о 12 условиях Европейского Союза, то выходит, что провозглашенная белорусская модель развития — *"стабильность и экономический рост"* — может функционировать только при условии ущемления фундаментальных прав своих же подданных. Если это так, то надо немедленно устранять существующие противоречия: надо срочно менять Конституцию страны с учетом уникальной особенности нашего развития или изъять ее из библиотек и запретить продажу через магазины. А пока от этого страдают наши дети, становясь потенциальными жертвами режима, т.к. они вольно или невольно знакомятся с Основным законом в средних школах, изучают его в институтах или совершенно случайно могут купить дешевую "крамольную книжку" в любом книжном магазине. Надо же беречь будущие трудовые ресурсы, ведь за счет них скоро будет пополняться государственный бюджет, в том числе и для выплат пенсий нынешним чиновникам.

В апреле прошлого года в Вильнюсе известные белорусские оппозиционные политики приняли решение сосредоточить все усилия на эволюционном переходе власти в руки демократов. Основным направлением в своей работе они видят использование всех возможностей переговорного процесса. Главное, по их мнению, — диалог с властью. Но *"об этом можно было бы говорить, если бы в Беларуси существовала оппозиция как значимая политическая структура". "Как можно проводить переговоры между группой мелких партий и теми, кто был избран непосредственно народом?"* — считает Л.Ермошина.

Но сегодня разговор не об этом. Продолжим по теме. Ну, как избираются у нас депутаты "непосредственно народом", говорить, видимо, не нужно. Если Ермошина полагает, что все вокруг слепые и глухие, она сильно ошибается. Наступит время, когда эти "слепые и глухие" скажут все, что они думают о ее действиях и действиях ее предводителей.

В своем интервью БелаПАН председатель Центризбиркома уверенно заявила, что пропрезидентская организация "Белая Русь" сыграет значительную роль во время проведения парламентских выборов в 2008 году.

А в этом никто и не сомневается. В нынешних условиях даже пигмеи лесов тропической Африки, ускоренно получив белорусское гражданство, еще успели бы сыграть *"значительную"* роль в осенних парламентских выборах в Беларуси.

Конечно, я не собираюсь здесь полемизировать с госпожой Ермошиной, в этом нет никакой необходимости, по крайней мере до тех пор, пока мы не услышим от Центризбиркома что-то вразумительное по поводу заключения Венецианской комиссии относительно референдума 2004 года. А ведь вопрос, вынесенный тогда на референдум, у комиссии и общественности страны вызывал ряд серьезных возражений. В определенной части он прямо противоречил Избирательному кодексу Беларуси. В нем смешивались незаконные привилегии для одного человека с весьма важной проблемой. Его принятие вело к увеличению дефицита демократии в стране, при чрезмерном сосредоточении власти в руках президента без надлежащих сдержек и противовесов.

В заключении этой комиссии отмечалось: *"Президент, как представляется, исходит из того, что выражение ему доверия на референдуме освободит его от каких бы то ни было обязательств соблюдать действующую конституцию и законы"*.

Действительно, что можно обсуждать с госпожой Ермошиной, если она об отчетах БДИПЧ/ОБСЕ, как и о подробном анализе этой организации на 38 листах по мартовским президентским выборам 2006 года, основанном исключительно на фактах, говорит: *"они носят вкусовой характер и не подчиняются никакой логике"*.

Кроме того, Центризбирком во главе с Л.Ермошиной до настоящего времени даже не пытался дезавуировать циничное утверждение А.Лукашенко по поводу незаконно внесенных властью изменений в результаты прошедших в 2006 году президентских выборов. Не своей же рукой Лукашенко менял первоначальные цифры.

(Окончание на 2-й стр.)

Шчыра віншуем!

7 красавіка споўнілася 50 гадоў кіраўніку Цэнтра прававой абароны СМІ пры Беларускай асацыяцыі журналістаў прафесару **Міхаілу ПАСТУХОВУ**.

"Народная воля" шчыра віншуе Міхаіла Іванавіча, нашага пастаяннага аўтара.

Сам юбіляр зазначыў у гэты дзень, што марыць і спадзяецца ўбачыць Беларусь краінай, дзе дзейнічае Канстытуцыя і законы, паважаюцца, выконваюцца і абараняюцца правы любога чалавека незалежна ад яго поглядаў, нацыянальнасці і становішча ў грамадстве.

М.Пастухоў нарадзіўся 7 красавіка 1958 года ў горадзе Сураж Бранскай вобласці. У 1980 годзе з адзнакай скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў у Інстытуце філасофіі і права Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Інстытуце нацыянальнай бяспекі Беларусі, суддзёй Канстытуцыйнага суда. Браў удзел у распрацоўцы шэрагу нарматыўных актаў, Канстытуцыі 1994 года і закона аб Канстытуцыйным судзе. Падчас грамадска-палітычнага крызісу 1996 года М.Пастухоў заняў прынцыповую пазіцыю, з-за чаго быў адпраўлены прэзідэнтам у адстаўку. Пасля гэтага стаў займацца праваабарончай дзейнасцю. М.Пастухоў з'яўляецца заслужаным юрыстам Беларусі, лаўрэатам міжнароднай прэміі "За развіццё дэмакратыі і грамадзянскай супольнасці" і членам-карэспандэнтам Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

І дыктоўку напісалі, і на «Народную волю» падпісалі

Пра агульнанацыянальную акцыю "Беларуская дыктоўка" ўжо шмат расказвалася. Не можам абысці ўвагай яшчэ адзін момант.

Прадстаўнікі аргкамітэтаў па стварэнні Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі і руху "За Свабоду!" пісалі яе разам з былымі вязнямі сталінскіх лагераў **Надзеяй ДЗЕМІДОВІЧ, Ірынай ШЭЙБАК, Міколам ПАЗЬНЯКОМ** і старшынёй грамадскага аб'яднання "Беларуская асацыяцыя палітычных рэпрэсій" **Зінаідай ТАРАСЕВІЧ**.

На пачатку сустрэчы юнакі і дзяўчаты падарылі былым вязням бел-чырвона-белыя кветкі. Затым супольна праспявалі духоўны гімн "Магутны Божа". Пасля была шчырая гутарка з гарбатай, падчас якой людзі, якія перажылі страшэнныя пакуты і здзекі, заклікалі моладзь не здраджваць справе нацыянальнага адраджэння, за якую старэйшае пакаленне свядомых беларусаў аддавала жыцці.

Падчас сустрэчы прадстаўнікоў аргкамітэтаў па стварэнні Беларускай хрысціянска-дэмакратычнай партыі і руху "За Свабоду!" нарадзілася добрая ініцыятыва. Маладыя палітыкі падпісалі былых вязняў ГУЛАГа на іх любімую газету — "Народную волю". Як сказала адна з арганізатараў акцыі **Лера ЧАРНАМОРЦАВА**, надалей яны намераны збіраць сродкі і пашыраць падпіску на "Народную волю" для ветэранаў і рэпрэсаваных.

«Усе маці імкнуцца да таго, каб іх дзеці былі на свабодзе»

Агульнанацыянальную дыктоўку ў бібліятэцы касцёла св.Сымона і Алены пісалі сваякі палітзняволеных, маці рэпрэсаваных палітыкаў. У іх ліку былі маці Аляксандра Казуліна спадарыня Яўгенія Канстанцінаўна Дутко, Галіна Сіўчык, Таццяна Кім, Раіса Кабанчук, Ядвіга Лабковіч, Таццяна Каспяровіч, Ада Чалей, Ларыса Сушкевіч, Валеры Дранчук, Ян-Вітаўт Сіўчык, Рыгор Кійка.

Яўгенія Канстанцінаўна Дутко сказала:

— Я прыйшла на гэтую дыктоўку таму, што мне хочацца выказаць салідарнасць да тых, хто сядзіць у турмах за палітычныя погляды. Мне хочацца, каб увесь свет даведаўся, што нашых герояў, якія хочуць, каб Беларусь была вольнай і свабоднай, трымаюць у турмах. І хочацца мне паказаць, што я люблю сваю мову, люблю сваю Радзіму і жадаю ёй лепшага жыцця. Свабоду ўсім нашым палітзняволеным, свабоду майму сыну Аляксандру Казуліну!

— Што вы сказалі б для ўсіх маці Беларусі, чые дзеці зараз сядзяць у турмах за свае палітычныя погляды?

— Безумоўна, усе маці сумуюць па сваіх дзецях, і ўсе маці імкнуцца да таго, каб іх дзеці былі на свабодзе. Бо гэта годныя дзеці нашай Радзімы. Трымайцеся, мілыя маці!

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

Даешь «социально значимых»!

В Беларуси выводится новая литературная порода?

Итак, Совет министров, наконец, добрался до настоящего дела. Среди вечных проблем с газом, с посевной, с ростом цен, с жалобами пенсионеров возникло нечто на этом фоне экзотическое.

Очередь дошла до литературы. На очередном заседании президиума СМ речь зашла о "социально значимой литературе". В который раз дивлюсь словесному искусству нашей бюрократии. И решительно отметаю упреки в ее бескультурности, тем более антиинтеллектуализме.

Ну посудите! О чем шла речь в советские времена, когда с властных вершин шла накачка по части той же литературы? Не забыли? Правильно! Говорилось ни больше ни меньше как о "повышении идейно-художественного уровня произведений советских писателей".

Времена нынче иные. И вот вам новенькое — *"социально значимая литература"*! А почему? А потому, что об идейности говорить вроде как стыдно сегодня, после формального отказа от коммунистического наследия. Хотя идеология государственная у нас имеется и соответствующие отделы и чиновники функционируют. Но все-таки напрямую требовать идейности както... ну не с руки... Что же касается *"художественного уровня"*, то здесь я понимаю определенные затруднения в ведомстве г-на Сидорского. Министрам, занимающимся в основном хозяйственными делами, вроде не пристало устанавливать уровни в изящной словесности.

И тогда изобретается этот бюрократический перл — *"социально значимая литература"*. Возможно, тут терминологическую помощь оказал и Союз писателей Беларуси во главе с выдающимся мастером слова наших дней Н.И.Чергинцом. Во всяком случае, судя по сообщениям, появившимся в прессе, премьер Сидорский трем министерствам — информации, культуры и образования — поручил *"согласовать действия по реализации социально значимой литературы на белорусском рынке"*.

Согласитесь, читатель, что все это как-то туманно выглядит. Но кое-что сквозь туман тем не менее проглядывает. Оказывается, этим самым министерствам предстоит составить, дальше читайте особенно внимательно, *график закупки социально значимой литературы, которая сегодня находится на складах издательств Министерства информации.*

Значит, и здесь прижала все-таки экономика. На этих самых складах скопился *"неликвид"*, который годами производили государственные издательства, в том числе книги *"правильных"* писателей. И как тут быть? Тем более что *"правильные"* желают и дальше издаваться и активно навещать кассу издательства "Мастацкая літаратура". Тут-то и возникает это весомое, посильнее прежних пустотело-идейных, выражение — *"социально значимая литература"*. Ну кто посмеет возражать против того, что произведения писателей из отряда, возглавляемого неутомимым Н.И.Чергинцом, принадлежат именно к такой литературе? Что они понимают в этом, министры коммунального и прочего хозяйств? Поэтому, не исключаю, Николай Иванович на том же заседании Совмина им доступно объяснил насчет формы, по которой следует определять социально значимую литературу. Форма или формула эта очень проста: издавать *"правильных"* писателей и, естественно, не издавать *"людей, негативно относящихся к государству и власти"*.

Казалось бы, и без того эта практика уже была в ходу. Этих самых *"негативов"* уже давно не издавали и издавать не собираются. Чего беспокоиться? Тем более, что соответствующий список "негативных публикаций" (авторами которых, естественно, являются *"неправильные"* писатели), как было объявлено министрам, ведется в Институте литературы Национальной академии наук. Последнее обстоятельство особенно восхищает. Выходит, есть в академическом институте сотрудник, да что там, наверняка целая группа, поскольку одному не управиться, плановой темой которой является составление своего рода "проскрипций", т.е. публикаций, как уточнил выдающийся писатель, *"направленных на подрыв власти, против социальных устоев государства"*. Немножко попахивает средневековьем, но что же делать, говорят, история ходит кругами.

Представляю, как вздрогнули при словах *"о подрыве"* министры разных хозяйств. Особенно, когда их пугнули предложением этих самых "негативно относящихся" внести в список *"социально значимой литературы"* произведения Ларисы Гениюш, Арсеньевой и Законникова. От такого страха тут не только за издание книг Чергинца и Аврутина проголосуешь... Пускай кормятся, только бы Совмин в пособничестве врагам не заподозрили.

И вот результат. Премьер поручил — продолжаю цитировать сообщения в прессе — *"определить необходимый объем средств, чтобы закупить для библиотек социально значимую литературу и, если необходимо, внести предложения в правительство"*. В переводе на более понятный язык это означает: государство (естественно, за деньги налогоплательщиков) будет выкупать "социально значимый" и пылящийся на складах "неликвид", сочиненный "правильными" писателями, и пихать его в библиотеки, где его уже и без того выше крыши. Ну и на торговлю можно будет надавить, хотя она тоже затарена книгами "правильных".

Но, видимо, проблема чересчур серьезна. Академическому институту одному не справиться. И Николай Иванович, истинно государственно мыслящий человек, предложил создать общественный совет, который будет определять *"перечень социально значимой литературы"*. Разумеется, к этой работе в первую голову должен быть привлечен возглавляемый им Союз писателей.

Воображаю себе работу этого совета, ежели бы были живы Гоголь, Толстой, Бунин...

— Автора "Ревизора" издавать? Да это поклеп на наше государство, на местную власть!

— Толстого? Да он оклеветал нашу судебную систему в "Воскресении"!

— Бунина? Такой грязью вымазать быт нашей деревни! Ни за что!

А что касается белорусских классиков, то существуют ли таковые вообще? Если верить широко известному в узких кругах поэту Анатолию Аврутину (см. его интервью в "Литературной газете" в сентябре минувшего года), *"известность подавляющего большинства белорусских писателей ограничивалась пределами Беларуси"*. Какой там Колас? Какой там Быков? Какой там Адамович? И вообще *"Минск значился среди литературных провинций"*. Но вот состоялось явление народу самого Анатолия Аврутина, строки из стихов которого — слушайте и не говорите, что вы не слышали! — *"берут в качестве эпиграфа известные писатели", о стихах которого "спорят на семинарах в Литературном институте"*. Естественно, когда Аврутина стали брать "в качестве эпиграфа", ситуация с белорусской литературой сразу стала исправляться. Теперь Аврутин и его соратники по новому, *"правильному"* Союзу писателей, с удовлетворением отмечается в том же интервью, *"стали и в школьной программе появляться, и книги в госиздательствах выпускать, и высокими наградами отмечаться"*. Более того, профессор Анатолий Андреев назвал Аврутина *"поэтом вполне нобелевским по своему уровню"*. В общем, настоящая белорусская литература — это теперь литература "русскопишущих", которых ранее давили, не пущали и оттесняли от кормушки. До сих пор помнится А.Аврутину страшная обида — только в 1991 г. он *"стал единственным русскопишущим поэтом из числа не состоящих в Союзе писателей, у кого вышел сборник в твердом переплете"*. Действительно, ужас! Столько лет ждал не встречи с читателем, а твердого переплета!

А теперь они, русскопишущие, на законных первых местах в белорусской литературе. Собственно, они и есть белорусская литература, поскольку язык здесь ни при чем. Белорусскую литературу можно при желании творить и на китайском. Было бы желание творцов и благосклонное внимание властей. И вот уже, на полном серьезе отмечается в том же интервью, Анатолий Аврутин *"на сегодняшний день, пожалуй, единственный белорусский писатель, чье творчество пользуется столь пристальным вниманием за пределами Беларуси"*.

Вам понятно, читатель? А.Аврутин — единственный белорусский (!) писатель, пользующийся известностью за рубежами Беларуси. Других нет! И точка! Да, закружилась бедная головка... Как писал шолом-алейхемовский Менахем-Мендл из Егупца своей жене Шейне-Шейндл в Касриловку, *"я шумлю, лечу, горю, в огонь прыгаю и расту, расту!"*. Но ведь не всем такой шум и такие прыжки могут понравиться. Не сообразил "единственный белорусский писатель", что негоже так прославлять себя на страницах ЛГ, поскольку есть ведь и другие, тоже претендующие... Видимо, что-то и с "нобелевским уровнем" не поделили в "чергинцовском" союзе. В общем, пришлось А.Аврутину, такому увенчанному, лауреату стольких премий, в том числе имени третьестепенного русского поэта Николая Минского (любопытно, кто учредил такую премию), и даже члену-корреспонденту Петровской академии наук и искусств (слыхали о такой?), оставить важнейший в деле собственного книгоиздания пост первого секретаря Союза писателей Беларуси. Так что у "правильных" тоже свои проблемы. Дерутся, черти, за место под лукашенковским солнцем. А место коротковатое, узковатое. На всех не хватает.

Поэтому очень своевременна идея Николая Ивановича насчет совета, который будет заниматься отбором *"социально значимой литературы"*. То, что враг здесь *"не пройдет"*, в этом, как и в том, что будут издавать своих, проверенных, надежных, можно не сомневаться. Будут ли учтены требования художественного уровня? Полагаю, что это проблемы второстепенные. Главное — это все-таки социальная значимость произведения. Вот в одном, к примеру, романе, вышедшем в Минске, президент США расстегивает штаны в своем кабинете в присутствии секретарши. Кому-то из эстетов может не понравиться, а ведь на самом деле это очень острая критика одновременно мирового империализма и западной распущенности. И, следовательно, книга социально значимая. Такие смелые книги и нужно издавать.

Надо сказать, что кое-кто воспринял меры по определению социально значимой литературы как введение своего рода цензуры. И даже стал ссылаться на Конституцию, согласно которой у нас в стране цензуры нет. Но, сограждане дорогие, сколько можно повторять: Конституция у нас сама по себе, а жизнь сама по себе. И коль скоро мы живем при полуавторитарном-полудиктаторском режиме, то без цензуры нам никак не обойтись. А уж в какой форме она будет существовать — это дело десятое. В общем, так или иначе, но дело движется к воскрешению знаменитого со времен инквизиции "Индекса запрещенных книг". У Сергея Ивановича Законникова появляется шанс для особой гордости. Целых 120 его публикаций, уже зарегистрированных в Институте литературы Академии наук, могут попасть в новейший "Index librorum Prohibitorum".

И, наконец, возвращаясь к "лозунгу дня", т.е. к *"социально значимой литературе"*... Вношу свое предложение в Совет министров. А почему, собственно, нужно что-то дельное выбирать из громадной графоманской кучи, навороченной членами все того же *"правильного"* союза писателей? Может, стоит придать выражению *"социально значимая литература"* истинный смысл и вместо пылящихся на складах скучных романов, примитивных детективов и унылых сборников стихов издавать действительно нечто полезное — книги по домоводству, садово-огородному хозяйству и проч. Может, это и есть *"социально значимая литература"*? Тем более в стране агрогородков.

Как бы то ни было, шансы на успех у покупателя здесь определенно выше. И правильно заметил премьер Сидорский: зачем библиотекам десять экземпляров одной энциклопедии? Достаточно одного, а рядом поставим пятьдесят экземпляров пособия по консервированию огурцов. Ну и, идя навстречу пожеланиям членов "правильного" Союза писателей, так и быть — рядышком с "огурцами" один детективчик Николая Ивановича и сборничек стихов лауреата премии имени Николая Минского. И по "социальной значимости" будет полный ажур!

ПОЗИЦИЯ

Госпожа Ермошина знает, что делать, а вот у оппозиции, по-моему, нет четкого плана

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Пока же власть *"элегантно"* выигрывает, выигрывает даже с перебором. А как, по какой формуле определить эффективность участия в подобных шоу оппозиции? Не исполняет ли оппозиция в этой игре, как говорил герой-разведчик из известного многосерийного фильма, роль болванчика в старом польском преферансе? Если предположить, что оппозицию в стране поддерживает только 10% граждан (около 750 тысяч избирателей), хотя на самом деле это далеко не так, то почему тогда в законодательный и местные органы никогда не попадают их представители? Почему 2/3 избирателей Минска, немедленно выключающие телевизор, как только начинаются трансляции селекторных шоу, не имеют своих депутатов в парламенте?

Несмотря на то, что число противников режима множится, я считаю, в Беларуси за последние годы создана и надежно работает такая система, когда подсчет голосов не имеет ничего общего с тем, как избиратели проголосовали в реальности. Фактически это означает, что всех наших граждан лишили одного из фундаментальных прав человека — права изменить ситуацию через выборы. Неужели еще можно надеяться на цивилизованный диалог по демонтажу созданной системы с ее авторами?

И все-таки, что можно сделать в такой, казалось бы, безвыходной ситуации?

Во-первых, убежден, что в созданных властью условиях участвовать в каких-либо "выборах" (на этапе голосования) оппозиции больше нельзя. Это не свидетельство готовности смириться с любым насилием над своей политической волей. Такая ясная и последовательная позиция будет понятна миллионам сторонников перемен, будет поддержана ими. Дело в том, что большинство белорусских избирателей уже давно во всем разобрались.

Во-вторых, по деяниям, совершенным должностными лицами в связи с нарушениями прав и свобод граждан, а также по всем нарушениям закона, допущенным ими при производстве дознания, предварительного следствия или при рассмотрении политически мотивированных дел в судах, уже сегодня независимыми специалистами должна даваться четкая квалифицированная оценка. А с составленными на этой основе списками из числа милиционеров, прокурорских работников и судей, вынесших неправосудные решения и приговоры, необходимо знакомить общественность страны. Вне всякого сомнения, многие их соседи по подъезду сразу перестанут здороваться с такими "героями" современности.

Должностных лиц, вынесших в отношении своих граждан заведомо неправосудные приговоры (решения), привлекавших в качестве обвиняемых заведомо невиновных, незаконно задерживавших или заключавших под стражу, фальсифицировавших доказательства, дававших ложные показания, — должны знать не только в нашей стране, но и на Западе, а также общественность России.

У лиц, попавших в эти черные списки, появится еще один повод задуматься над неизбежностью наказания после падения режима. Кроме того, им, в своем большинстве юристам, хорошо известно, что моральный вред подлежит денежному измерению, а сроков исковой давности по его возмещению нет. Не думаю, что сотни сегодняшних жертв режима завтра молча будут созерцать, как их обидчики — ветераны правоохранительной системы, уйдя на *"заслуженный"* отдых, с чувством исполненного долга получают пенсии, превосходящие среднюю зарплату по стране.

По стечению обстоятельств мы все в той или иной степени оказались заложниками. Похоже, что наше будущее и будущее наших детей становится предметом торга. Правозащитные организации, на мой взгляд, сейчас должны помочь гражданам правильно сориентироваться в такой сложной ситуации. К примеру, до предстоящих парламентских выборов необходимо распространить среди избирателей информацию о консолидированной позиции оппонентов режима; разработать текст памятки, с предложениями быть внимательными, запоминать и записывать фамилии должности лиц, даты и места преступных деяний, совершенных ими, фамилии и адреса свидетелей и потерпевших. В этой памятке нужно разъяснить людям их права по самозащите своих гражданских прав, в соответствии с действующими в стране законами, как себя вести, если гражданина, прогуливающегося по тротуару своего родного города, начнет ломать незнакомый детина. Люди должны знать, как себя вести, заходя в подъезд дома, и при неожиданных обысках и задержаниях. Что можно брать с собой при заключении под стражу и т.д.

И самое главное — что делать, если всех нас скопом начнут обменивать на российский газ. Не спрашивали же у нас разрешения на строительство атомной станции или продажу "Газпрому" половины принадлежавшей нам, белорусам, собственности "Белтрансгаза".

К сожалению, сейчас большинство белорусских граждан о политических заключенных в нашей стране ничего не знают. Наши соотечественники не имеют представления, по какой причине законопослушные и честные люди брошены в тюрьмы, в каких условиях они там содержатся, почему некоторых из них власть вынуждена была выпустить на свободу.

Что же касается диалога с властью, то власть вынуждена будет пойти на него лишь тогда, когда мы будем готовы к этому сами, когда научимся договариваться между собой, когда соберемся воедино и будем последовательны в своих действиях. А может случиться, что к тому времени и диалог с властью уже не понадобится.

Олег ИГНАТЕНКО, экономист.

Минск.

З-ЗА КРАТАЎ

Аперацыя «Блакада»

Дачка Аляксандра Казуліна Юлія абнародавала ліст ад бацькі, у якім паведамляецца, што ў калоніі да яго пачалі ставіцца больш жорстка.

"Тут пасля ўвядзення ЗША санкцый пачаліся санкцыі ў адказ супраць атрада, у якім я знаходжуся, — распавёў Аляксандр Уладзіслававіч у лісце родным. — Праводзіцца шырокамаштабная аперацыя, мяркую, пад кіраўніцтвам спецслужбаў, пад назвай "блакада Казуліна". Яе мэта — абсалютная ізаляцыя мяне ад знешняга свету, ад грамадства.

За кожным маім чыхам назірае натоўп розных кантралёраў. Тут кажуць, што засталося толькі пакласці спаць побач са мной начальніка аператыўнай часткі калоніі. У астатнім уся праграма: відэаназіранне, праслухоўванне, вывад з калоніі тых, каго хоць у чымсьці падазраюць адносна кантактаў са мной".

Таксама экс-кандыдат у прэзідэнты расказаў пра рэпрэсіі ў дачыненні да тых супрацоўнікаў калоніі, якія паставіліся да яго па-чалавечы, калі памерла яго жонка Ірына:

"Рэжым у калоніі стаў настолькі жорсткім, што найменшая памылка можа дорага каштаваць супрацоўнікам калоніі. Толькі за тое, што ў цяжкі момант майго жыцця, 10 лютага, зампаліт калоніі падпалкоўнік Клім Коваль даў мне магчымасць пазваніць дамоў, каб пагаварыць з цяжка хворай жонкай, яго фактычна выгналі з працы. Яго адразу адправілі ў адпачынак, з якога, як сказалі, ён ужо не вернецца. Ёсць звесткі, што супраць яго збіраюцца завесці крымінальную справу. А гэта была мая апошняя размова з жонкай. Коваль зрабіў усё па-чалавечы і не парушыў закона".

Адвакат Зміцер Гарачка, які днямі наведаў свайго падапечнага ў "Віцьбе-3", таксама паведаміў родным, што стаўленне да Казуліна апошнім часам стала значна больш жорсткім.

СТАЛІЦА

Цэнтр Мінска забудуюць арабы

25 гектараў сталічнай прасторы маюць намер забудаваць прадстаўнікі Аману.

Прадстаўнік інвестара — выканаўчы дырэктар дзяржаўнага генеральнага рэзервовага фонду Султанату Варыт Аль Харусі — запэўнівае, што гэта будуць архітэктурныя шэдэўры. Да праектавання забудовы цэнтра Мінска аманскія інвестары запрасілі адну з самых знакамітых брытанскіх кампаній — "Чэпмен Тэйлар". Варыт Аль Харусі лічыць Мінск самым прывабным рэгіёнам нашай краіны.

Паўгода таму інвестары папрасілі зарэзерваваць за імі некалькі ўчасткаў у Мінску. Там, дзе зараз станкабудаўнічы завод імя Кірава, прапанавана пабудаваць жылы комплекс. Па вуліцы Купалы, на месцы выставачнага цэнтра і 2-й бальніцы, плануецца дзелавая забудова з раскошнай гасцініцай і набярэжнай.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

ЧУЛІ?

Апошні фонд сыходзіць з Беларусі

Кіраўнік Рэгіянальнага прадстаўніцтва Фонду імя Фрыдрыха Эберта ва Украіне і Беларусі Штэфан Хробат заявіў пра пачатак працэсу закрыцця прадстаўніцтва ў Мінску.

Гэта быў адзіны афіцыйна зарэгістраваны замежны палітычны фонд, які працаваў у Беларусі з 1997 года.

Кіраўнік акрэдытаванай у Беларусі філіі прадстаўніцтва Фонду Фрыдрыха Эберта Сяргей Анацка паведаміў:

"Гэта перадусім выклікана тым, што змяніліся ўмовы працы. У тым ліку змянілася заканадаўства Беларусі, таму фонд мусіць зачыняцца. Ёсць такі дакумент, як "Палажэнне аб прадстаўніцтвах", калі раней трэба было, каб МЗС, Мінюст ці суд прымаў рашэнне аб закрыцці арганізацыі, то сёння атрымліваецца, што спецыяльнага рашэння прымаць не трэба. Проста не працягваюць рэгістрацыю, і прадстаўніцтва аўтаматычна лічыцца зачыненым. Таму фонд сам змушаны пачынаць працэс закрыцця. Былі падрыхтаваны ўсе дакументы, яны былі пададзены, але мы не атрымалі адказу. У МЗС на наш запыт не патлумачылі, з якіх прычын фонду Эберта не працягнута афіцыйная рэгістрацыя".

Фонд імя Фрыдрыха Эберта падтрымліваў у Беларусі вялікую колькасць кантактаў як з грамадскімі арганізацыямі, так і з дзяржаўнымі ўстановамі. Для прадстаўнікоў няўрадавых арганізацый і афіцыйных ведамстваў рэгулярна ладзіліся семінары і "круглыя сталы". Так, летась кіраўніцтва фонду арганізавала ў Мінску дыспут памяці Федэральнага прэзідэнта Германіі Яганэса Раў, дзеля чаго ў Беларусь былі запрошаны вядомыя нямецкія палітыкі.

Прадстаўніцтва нямецкага фонду з галоўным офісам у Берліне працуе больш як у сотні краін свету. У кіеўскім офісе працэс закрыцця філіі фонду Эберта называюць *"прыкрым для Беларусі фактам"*.

Леаніду Левіну — нямецкі ордэн

Старшыня Саюза беларускіх яўрэйскіх грамадзянскіх арганізацый і абшчын Леанід Левін атрымаў ордэн "За заслугі перад Нямецкай Фэдэратыўнай Рэспублікай".

Узнагароду ад імя прэзідэнта Германіі славутаму скульптару і грамадскаму дзеячу ўручыў амбасадар у Беларусі Гебхарт Вайс.

У прэсавым рэлізе амбасады адзначаецца, што гэты ордэн — "знак прызнання асаблівых заслуг спадара Левіна ў справе прымірэння і ўзаемаразумення паміж грамадзянамі Беларусі і Германіі".

Упершыню за дваццаць гадоў

Упершыню за апошнія 20 гадоў па выніках трох месяцаў гэтага года смяротнасць сярод гарадскога насельніцтва Беларусі не перасягае нараджальнасць. Аб гэтым паведаміў намеснік міністра аховы здароўя Беларусі Віктар Рудэнка.

ІНЦЫДЭНТ

Невыязная...

Актывістка незарэгістраванага "Маладога фронту" Наста Палажанка была знятая з цягніка "Мінск—Варшава".

На памежным пераходзе "Варшаўскі мост" беларускія памежнікі паведамілі ёй, што яна знаходзіцца ў спісе невыязных, бо супраць яе распачата крымінальная справа.

Зараз Наста спрабуе высветліць, што ж гэта за справа, бо пра яе існаванне дзяўчына наогул нічога не ведае.

НЕЛЬГА МАЎЧАЦЬ

АЭС: крок да стварэння ядзернай бомбы?

Вучоныя Новасібірскага аддзялення Расійскай Акадэміі навук, шукаючы перспектывы развіцця атамнай энергетыкі на сто год наперад, прааналізавалі сусветны вопыт у гэтай галіне, а разам і альтэрнатывы порсткаму "мірнаму атаму". Нашы "атамшчыкі", многія з якіх, на жаль, не маюць ні адукацыі ў ядзернай галіне, ні жадання аналізаваць вопыт свету, усё ж бубняць: нам трэба мець сваю АЭС. Ці трэба з імі пагаджацца?

Адразу зазначу: пасля чарнобыльскай катастрофы будаўніцтва АЭС у свеце крута пайшло на спад. Расійскія вучоныя прыйшлі да такой высновы: няма перспектыў у атама! І гэта важна ўцяміць кожнаму! Пра гэта ж наглядна сведчыць і дыяграма, складзеная прафесарам А.Нячаевым. А вось лічбы. Толькі за 1971—1998 гады, па дадзеных МАГАТЭ, прыпынена будаўніцтва 21 рэактара і пастаўлены крыж на будаўніцтве 67 запланаваных.

Прыкладна 30 гадоў таму МАГАТЭ разлічвала будаваць штогод больш за 170 атамных блокаў, а цяпер ужо мусіць радавацца, калі выпадае 3—4 блокі ў год.

Апошнім часам атамныя электрастанцыі будуюць у асноўным дзяржавы не дужа развітыя, і то пераважна з канфліктных рэгіёнаў. Дзякуючы гэтакай нячыстай сіле яны хацелі б выправіць альбо павысіць сваё становішча ў свеце, задаволіць амбіцыі. Адсюль і мэта: напрацаваць на рэактарах свой плутоній і потым стварыць або, стварыўшы, нарошчваць на ім ядзерную зброю. Гэта — Кітай, Іран, Турцыя, Індыя, Пакістан, Паўночная Карэя, Аргенціна, Бразілія... Магчыма, не з'яўляецца выключэннем з гэтага шэрагу і наша Рэспубліка Беларусь. Можа, дзеля гэтага і робяцца высілкі?

Між тым адмаўляюцца ад будаўніцтва новых АЭС такія краіны, як ЗША, якія даўно ўжо набылі атамную зброю, альбо такія, якія не збіраюцца яе набываць, — Германія, Францыя, Японія... У Іспаніі, Швецыі, да прыкладу, сёння — тэндэнцыя на ліквідаванне АЭС наогул. У Італіі атамныя станцыі спынены.

У заканадаўстве шэрагу краін уведзена забарона на развіццё і выкарыстанне атамнай энергетыкі ў будучым — тая ж Германія, Бельгія, Аўстрыя, Данія. На долю АЭС цяпер прыпадае ўсяго 3—4 працэнты электраэнергіі ад той, якая выпрацоўваецца ў свеце.

Нядаўна ў Мінску адбылася нарада ініцыятыўнай групы дасведчаных у энергетычнай галіне асоб і грамадскіх дзеячаў, якія абмеркавалі прынятае Саветам бяспекі Рэспублікі Беларусь рашэнне ад 15 студзеня 2008 года аб будаўніцтве ў краіне атамнай электрастанцыі.



Дынаміка прыросту "ядзернай" электраэнергіі на АЭС свету, ТВт х гадзіну

З аналізам перадумоў для такога стратэгічнага кроку ў эканамічным і гаспадарчым жыцці краіны выступілі вучоныя Віктар Пяшко, Георгій Лепін, Ягор Фядзюшын, Мікалай Лаўрэнцьеў, Валянцін Ламан, Мікалай Панцішын, а таксама эколаг-публіцыст Валеры Дранчук і аўтар гэтых нататак.

Дыскусія выявіла, некалькі шмат прыкрых момантаў.

Па-першае, рашэнне Савета бяспекі грубейшым чынам парушае патрабаванне Орхускай канвенцыі, падпісанай урадам нашай краіны, пра што "Народная воля" ўжо неяк пісала. Гэтай канвенцыяй прадугледжваецца ўзгадненне падобнага кроку з грамадскасцю, абмеркаванне праекта на этапе ТЭА ў друку і правядзенне нацыянальнага рэферэндуму. А ў нас што? Дзяржаўныя СМІ друкуюць толькі артыкулы тых, хто выступае за будаўніцтва АЭС, і не прадастаўляюць слова апанентам. Пра рэферэндум і размовы няма. Што гэта?.. Наважваюцца завезці ў наш агульны дом бомбу і не пытаюцца дазволу.

Па-другое, Савет міністраў Рэспублікі Беларусь з дзесятак гадоў таму, па рэкамендацыі Палаты прадстаўнікоў, у якой тады абмяркоўвалася пытанне аб будаўніцтве АЭС, утварыў Урадавую камісію па ацэнцы мэтазгоднасці развіцця ў Беларусі атамнай энергетыкі (распараджэнне №88р за 1.03.1998 г.). У яе ўвайшлі як прыхільнікі ядзернай канцэпцыі, так і апаненты, усяго 34 асобы.

І пасля працяглага даследавання праблемы Урадавая камісія прыйшла да высновы, што дзяржаве належыць *"максімальна выкарыстоўваць наяўныя рэсурсы для рэалізацыі энергазберагальных тэхналогій, выкарыстання альтэрнатыўных крыніц энергіі, рэканструкцыі і будаўніцтва парагазавых установак"*.

І далей:

"У бліжэйшыя 10 год немэтазгодна пачынаць будаўніцтва атамнай электрастанцыі, але неабходна працягваць працу па развіцці атамнай энергетыкі ў будучыні".

Пры падпісанні дакумента, праўда, выявіўся разнабой у думках: частка членаў камісіі была незадаволена той фразай, што стаяла пасля "але", і таму ў іх з'явілася абачлівая прапанова: у пункце 2, дзе "*неабходна працягваць"*, — запісаць *"магчыма падоўжыць навуковыя работы"*, і подпісы: Ермашкевіч, Ігнацішчаў, Лепін, Несцярэнка, Савановіч, Смоляр, Цяўлоўскі.

У заключным дакументе быў і яшчэ адзін пункт. Урадавая камісія рэкамендавала Савету міністраў і НАН Беларусі распрацаваць і ва ўстаноўленым парадку ўнесці ў Палату прадстаўнікоў на разгляд праект закона "Аб выкарыстанні атамнай энергіі".

Прайшоў час, і цікава, што ж мы маем на сённяшні дзень?

Мараторый на будаўніцтва АЭС заканчваецца 28 красавіка 2009 года, пазіцыя аб распрацоўцы альтэрнатыўных відаў энергетыкі не выканана, і гэта падобна ўжо на выклік грамадству.

Сапраўды, тагачасныя кіраўнікі ўрада, дзеячы з профільных устаноў і НАН Беларусі, якім урад даў канкрэтнае даручэнне займацца альтэрнатыўным энергазабеспячэннем, пальцам не паварушылі, каб зрабіць хоць што-небудзь. Ці ж не яны, гэтыя дзеячы, разам з апантаным "аэсаўцам" Міхалевічам масцілі і мосцяць шлях да "атамнай бомбы, якая дае электрычнасць" (словы акадэміка Капіцы). У іх далібог усе спадзяванні на "бомбу", якая, выбачайце, стане звышнебяспечнай мінай для краіны і затармозіць, калі не паралізуе, развіццё эканомікі на доўгі час.

Меркаванне: *урад краіны павінен у аператыўным парадку ўзнавіць працу Камісіі па ацэнцы мэтазгоднасці развіцця ў краіне атамнай энергетыкі.*

У дырэктыўным парадку будаўніцтва АЭС у Беларусі можа быць распачата, але ці будзе яно завершана? Ці вытрымае шалёныя затраты эканоміка? Выдаткі ж нікім усур'ёз не падлічаны, не распрацаваны бізнес-праект. Наколькі мне вядома, Інстытут эканомікі НАН Беларусі застаўся ўбаку ад важнай справы. А за сем апошніх гадоў кошт ядзернага паліва ўзрос у 21 раз, прыроднага газу — у тры разы, і не выключана, што кошт уранавых зборак на момант умоўнага адкрыцця атамнай электрастанцыі яшчэ раз удзесяцярыцца. Наогул, на той час, калі плануецца адкрыццё "нашай" АЭС, запасы ўрану, магчыма, наогул вычарпаюцца.

Як паказвае сусветны вопыт, закрыццё і ліквідацыя АЭС каштуюць столькі ж, колькі і яе будаўніцтва, што варта таксама наматаць сабе на вус.

А падрыхтоўка плоймы спецыялістаў з нуля?..

Жахліва падумаць, куды цягнуць нас людзі, агаломшаныя ідэяй "уласнай" АЭС на беларускай зямлі. Выбух на Чарнобыльскай АЭС даў дзесяткі, сотні, многія тысячы ахвяраў! Зрэшты, гэта ж і падказала свету зрабіць ход назад. Толькі ў нас ніхто нічому не вучыцца.

Возьмем, нарэшце, бяспеку і энергетычную незалежнасць краіны. І тут ні пра што добрае, слушнае, існае гаварыць не даводзіцца. Наадварот.

Амерыканскі вучоны Сімур Мелман называе атамную энергетыку, калі не дзеля грымучай справы яна развіваецца, "вытворчасцю без прыбытку", і кніга ў яго носіць гэткую ж назву.

Меркаванне: *яшчэ ў сярэдзіне 1990-х гадоў Беларускі сацыяльна-экалагічны саюз "Чарнобыль" прапанаваў ААН рэфармаваць структуру МАГАТЭ ў міжнародную службу, якая б займалася прапагандай і развіццём альтэрнатыўных відаў энергетыкі. Наспеў час нашай грамадскасці абмеркаваць і, магчыма, зрабіць падобную прапанову паўторна.*

Жарэс Алфёраў, расійскі акадэмік, які закончыў школу ў Мінску, выдаў у свой час для чалавечай супольнасці свае яскравыя падлікі: *"Калі б на развіццё альтэрнатыўных крыніц энергіі было выдаткавана толькі 15 працэнтаў сродкаў, якія выкідваліся на развіццё атамнай энергетыкі ў СССР, то АЭС для вытворчасці электраэнергіі наогул не спатрэбіліся б"*.

За апошнія гады ў свеце актыўна пачала развівацца альтэрнатыўная энергетыка — сонечная, асабліва ветравая. Экалагічна вытворчасць электрычнасці і цяпла тут зусім чыстая, не трэба мудрыць з бомбай. Усё гранічна проста... Беларусь — пагоркавая краіна, і ў беларускіх цеплаэнергетыкаў ужо ёсць распрацоўкі і слушныя меркаванні па развіцці ветравой рухаючай сілы, нават пры ціхай плыні паветра. Балазе Германія прапаноўвае тут свае паслугі.

А вось энергазберагальныя тэхналогіі, пры ўмове, што імі ў нас, нарэшце, зоймуцца, дадуць нам 30—40, а ў некаторых выпадках і болей працэнтаў эканоміі электраэнергіі. На Захадзе лічыцца, што інвестыцыі ў энергазбераж энне прыкладна ў 4 разы больш эфектыўныя, чым стварэнне новых генерыруючых электрычнасць магутнасцяў. Але спецыялісты на гэтую справу ў нас пакуль не наваліліся. У іх не хапае сродкаў на абнаўленне тэхналогій. Затое ў кіраўнікоў галіны *"ёсць грошы"* на будаўніцтва суперзатратнай і кабальнай для народа і нацыі атамнай станцыі.

Гарачыя прыхільнікі і ініцыятары будаўніцтва АЭС у нашай краіне, пачынаючы з Аляксандра Міхалевіча, чалавека, імпэт якога ў расквечванні аргументаў на карысць АЭС проста такі здзіўляе, і заканчваючы спікерам Палаты прадстаўнікоў, цяпер наогул адмаўляюцца адказваць на пытанні і аргументы сваіх апанентаў. І тут ствараецца небяспечная сітуацыя эканамічнай і экалагічнай асуджанасці народа.

Усё паказвае на тое, што Савет бяспекі Рэспублікі Беларусь сваім беспрэцэдэнтным рашэннем аб будаўніцтве АЭС на Беларусі стварае не бяспеку для свайго народа, а рыхтуе ядзерную прорву і яшчэ большую, чым цяпер, нястачу, рыхтуе пастку, у якой неўзабаве апынуцца вымушаныя расплачвацца за нашыя даўгі дзеці і ўнукі.

Хочацца верыць у лепшае. Галава патрэбна чалавеку, каб зрабіць немагчымае, а ўсведамленне і розум — каб вызначыць, ці патрэбна рабіць тое наогул. Менавіта гэта даводзіў людзям мудрэц Зянон з Кітыёна яшчэ за два з паловай стагоддзі да нашай эры. Тое ж самае сёння даводзяць гора-атамшчыкам іх апаненты.

У мэтах процістаяння невуцтву, беспадстаўным міфам аб таннасці ядзернай энергетыкі, дзеля процістаяння атамнай алігархіі ды растранжырванню народных сіл і сродкаў запачаткаваны грамадскі рух "За бяз'ядзерную энергетыку Беларусі".

Арганізатары дыскусіі разлічваюць на падтрымку гэтага руху шырокім колам вучоных, грамадскіх дзеячаў, грамадзян краіны.

Кантактныя тэлефоны: (МТС) 552-30-90, (Velcom) 103-60-03.

Васіль ЯКАВЕНКА,
кіраўнік Беларускага сацыяльна-экалагічнага саюза "Чарнобыль".

«К нам приехал ревизор...»

Репортер "Народной воли" торговала женской одеждой в одном из столичных торговых центров.

Собираясь на новую работу, я думала: что может быть легче, чем продавать одежду? Главное, улыбаться покупателям и быть к ним внимательной. На деле все оказалось не так просто. О том, что должен обязательно знать любой индивидуальный предприниматель, мне рассказали мои опытные коллеги.

Спрячь все вещи от воришки

Торговый центр ежедневно посещают тысячи людей. Среди них есть те, кто всегда готов нажиться за чужой счет.

Личные вещи продавцу лучше спрятать. Сумки и верхнюю одежду надо вешать так, чтобы никто, в том числе иногда и вы сами, не могли их найти. Что же касается наличных денег, то их лучше рассовать в карманы и обувь. За продаваемым товаром нужно следить во все глаза. Воришку крайне просто определить: он никогда не ходит один, потому что в одиночку очень сложно что-либо украсть. Обычно случается стандартная ситуация: в торговое место заходят сразу несколько человек, чаще всего у них много пакетов. Они становятся возле стенда с одеждой и начинают сумбурно ее перебирать. В это время один из пакетов открывается, вещь с вешалки потихоньку стягивается... А пропажу можно сразу и не заметить.

Есть и другой очень распространенный вариант: человек просит что-либо примерить. За одной вещью следует другая, пятая, десятая. Покупатель уходит, а ты, развесив товар, обнаруживаешь пустую вешалку...

Контрольная закупка

Многие наверняка только по телевизору видели, как происходит контрольная закупка. Когда работала в торговом центре, это "налоговое чудо" произошло прямо у меня на глазах. В боксе напротив торговали бытовой техникой. К продавцу подошли молодой человек и пожилая женщина, которые очень быстро выбрали пылесос и протянули деньги. Продавец, радостная, что у нее что-то купили, упаковала чудо-технику и отсчитала сдачу.

"А чек? Почему не дали нам чек?" — этот вопрос приводит в ужас. Как оказалось, это была контрольная закупка. После нее, как правило, следует проверка всех документов, и если каких-то бумаг не хватает, весь твой товар могут конфисковать...

Кстати, о визитах проверяющих из налоговой службы (за глаза их называют ревизорами) продавцы частенько узнают еще до того, как их нога ступит на территорию торгового центра. Если к тебе приходит проверка, не исключено, что ее "пригласили"... твои соседи.

А деньги есть?

На самом деле непросто сразу определить, есть ли деньги у покупателя, который примеряет все подряд. Главное правило — не вспоминать пословицу о том, что встречают по одежке. В Беларуси, да и во многих других странах, посмотрев на некоторых богачей, никогда не скажешь, что их кошелек ломится от денег. Иногда к тебе в бокс заходит девушка, одета по последнему писку моды, а за душой — ни гроша. Бывает, человек одет так, как будто всю жизнь копил на новые ботинки, а достанет пачку купюр и, как говорится, "отстегивает не глядя".

Большинство опытных продавцов давно научились определять не вид, а стоимость одежды. Может быть, на девушке простой джемпер, но стоит он бешеных денег, да и часы явно не от фирмы "Луч".

Случаются и совсем нелепые ситуации: клиент долго примеряет вещь, вздыхает — очень хочется ее купить, а денег нет. Говорит: приду к вам после зарплаты. И появляется месяца через полтора-два, когда вещь, запавшая ему в душу, уже давно продана. "Как продана?" — искренне удивляются многие покупатели. Такое ощущение, что для отдельных белорусов время просто стоит на месте...

Лилия ВОЛКОНСКАЯ.

СЛЫШАЛИ?

Россия уже в этом году постарается ввести единую валюту с Беларусью

Об этом заявил в эксклюзивном интервью заместитель председателя Совета Федерации **Александр Торшин** во время видеомоста Минск—Москва.

— *Ввести единую валюту мы постараемся в этом году,* — сказал Торшин. — *Работа идет серьезная. Два наших банка уже оперируют в Беларуси. Условия создания единой валюты уже есть. Надеюсь, до конца года этот вопрос будет решен.*

ОТ РЕДАКЦИИ:

А нам, белорусам, это нужно? Сегодня потеряем свои деньги, а завтра — независимость.

Сравнения с Европейским Союзом, к которым прибегают апологеты имперской идеи, здесь, думается, абсолютно неуместны.

Медыкі рыхтуюцца да аперацыі па перасадцы сэрца

Першыя ў Беларусі аперацыі па перасадцы сэрца і падстраўнікавай залозы плануецца правесці ўжо ў наступным годзе, паведаміў віцэ-прэм'ер Аляксандр Косінец.

З бел-чырвона-белым сцягам Мінкульт яшчэ не вызначыўся

Міністэрства культуры разглядае адозву грамадскасці аб наданні бел-чырвона-беламу сцягу статусу нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці. Пра гэта паведаміў у інтэрв'ю БелаПАН старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры" Антон Астаповіч. Такім чынам, зазначыў ён, на час разгляду гэты сцяг знаходзіцца пад аховай дзяржавы.

З прапановай уключыць бел-чырвона-белы сцяг у Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь старшыня аб'яднання звярнуўся ў Мінкульт 26 лютага ў сувязі з 90-годдзем абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

У адказе на адозву грамадскасці намеснік міністра, старшыня Беларускай рэспубліканскай навукова-метадычнай рады на пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны Уладзімір Грыдзюшка паведаміў, што прапанова таварыства "з мэтай атрымання дадатковых звестак" накіравана ў Інстытут гісторыі і Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

У інтэрв'ю БелаПАН А.Астаповіч зазначыў, што 31 сакавіка ён пісьмова звярнуўся ў вышэйназваныя акадэмічныя ўстановы з прапановай уключыць прадстаўнікоў таварыства ў склад экспертных камісій, якія будуць разглядаць адозву грамадскасці аб наданні бел-чырвона-беламу сцягу статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці. Паводле яго слоў, на перыяд разгляду прапановы бел-чырвона-белы сцяг ахоўваецца дзяржавай згодна з артыкулам 22 закона "Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны".

Бел-чырвона-белы сцяг з 1991-га па 1994 год быў адным з сімвалаў беларускай дзяржаўнасці, а бел-чырвона-белыя стужкі з'яўляюцца элементамі сімволікі зарэгістраванага грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" і Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы. Некалькі гадоў таму герб "Пагоня" быў уключаны ў Дзяржаўны спіс нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь.

Марат ГАРАВЫ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

ОТКРЫТОЕ ПИСЬМО

Нельзя, чтобы над человеком измывались только за то, что он сказал правду

Я хочу поблагодарить всех, кто своими письмами поддерживал меня в трудную минуту. Их было столько, что на все я просто не успевал отвечать.

Я благодарен мировой общественности, правозащитным организациям стран ЕС, Администрации президента США, ставших на защиту моих прав. Я убежден, что только их твердая позиция и принятые ими решительные меры позволили мне и другим узникам совести обрести свободу.

Пройдя за пять лет все круги ада, отсидев за решеткой по сфабрикованному обвинению, смысл которого на протяжении этого времени неоднократно менялся, могу с уверенностью сказать, что сейчас простой белорусский человек бесправен. В нашей стране он находится в полной зависимости от прихоти любого клерка вертикали власти. Я могу говорить об этом утвердительно потому, что на собственной шкуре испытал — кумовство и коррупция в Беларуси сильнее закона. Я на личном опыте убедился, что любой закон у нас можно трактовать поразному, в зависимости от того, чьи интересы при этом пересекаются. Сейчас никто и никогда не сможет убедить меня в том, что судьи в нашей стране всегда принимают решения самостоятельно, а не по указанию сверху, и что эти решения справедливы.

Я никогда не был согласен и никогда не соглашусь с приговором суда, потому что не совершал уголовно наказуемых деяний. За весь период своей предпринимательской деятельности я не обошел ни одного пункта президентского указа или декрета, я не допустил ни одного нарушения, за которое меня можно было назвать преступником и до суда упрятать за решетку.

Меня в суде назвали создателем незаконной схемы работы, обвинив в уклонении от уплаты налогов. Хотя на самом деле истинными ее создателями являются те, кто разрабатывал и подносил на подпись непродуманные законодательные акты, вызывающие в народе массовые возмущения.

Я не сомневаюсь, что президент Республики Беларусь был в курсе происходящего, как не сомневаюсь и в том, что, докладывая главе государства о сути якобы совершенного мною преступления, эти "законотворцы" лгали, боясь ответственности, в том числе и уголовной, за свое "законотворчество". Уверен, что время все расставит по своим местам.

Конечно же, основной причиной "наезда" на меня была вовсе не моя "незаконная" предпринимательская деятельность, хотя завистников, прежде всего из числа местных чиновников, у меня было немало. Вал налоговых проверок, санкционированных на самом высоком уровне и приведших впоследствии к фабрикации против меня уголовного дела, обрушился на меня только после того, как я заявил о коррупции в Гродненской области в правоохранительные органы.

В октябре 2005 года, сразу же после моего открытого обращения к президенту, в котором я изложил документально подтвержденные факты чиновничьих преступлений, меня упрятали в СИЗО Гродненской тюрьмы.

Анализ моего уголовного дела наглядно показывает, что судебная система нашей страны в очередной раз дискредитировала себя, определив меня как уголовного преступника в деле, которое до сих пор является предметом неразрешимых споров в самой юридической среде нашего государства. На сегодняшний день существуют два противоречащих друг другу, вступивших в законную силу судебных решения в отношении моей предпринимательской деятельности — решение Высшего Хозяйственного суда и приговор Октябрьского районного суда г.Гродно, который Верховным судом Республики Беларусь оставлен без изменений. И по каждому из этих судебных постановлений в порядке исполнительного судопроизводства производится изъятие моего имущества! Нормальному человеку это трудно себе представить и не надо иметь юридического образования, чтобы понять — одно из этих решений является противозаконным. Но чем объяснить, что Генеральная прокуратура, зная об этом, допускает, чтобы одно и то же деяние явилось предметом рассмотрения двух разных судов и эти суды, дав диаметрально противоположную оценку обстоятельствам дела, одновременно наложили на меня несоизмеримые с моими доходами экономические санкции? Как мне назвать этот факт — некомпетентность, нежелание исполнять свои обязанности или как-то иначе?

На самом же деле объяснение всему этому беспределу очень простое. Прокуратура закрывает глаза на него вполне осознанно. Меня хотят растоптать, унизить и разорить для того, чтобы на моем примере показать — вот так будет с каждым, кто попытается посягнуть на власть. В цивилизованном мире нет оправдания подобным действиям чиновников!

Мне очень хочется жить в правовом государстве. Нельзя, чтобы в наше время в центре Европы над человеком измывались только за то, что он сказал правду.

Я буду добиваться справедливости и, если власть не повернется ко мне лицом, буду искать любые способы, чтобы эту справедливость восстановить. Я не собираюсь никому прощать, а поэтому сегодня я вынужден обратиться к главам демократических государств, к международным правозащитным организациям, к членам ПАСЕ и Комиссии по правам человека с просьбой инициировать независимую юридическую экспертизу моего уголовного дела. Возможно, эта экспертиза и послужит началом строительства правового государства в Беларуси, а у многих, незаконно осужденных, появится какая-то надежда.

Одно я знаю точно — у меня осталось достаточно сил и решимости отстоять свою невиновность, остановить произвол и грабеж и вернуть заработанное за 25 лет честное имя и свое имущество.

Николай АВТУХОВИЧ,
житель Волковыска.

ЮРИДИЧЕСКАЯ КОНСУЛЬТАЦИЯ

Падумайце, ці хочаце вы супрацоўнічаць з нашчадкамі катаў з НКВД

У мяне да вас вельмі далікатнае пытанне, таму і падпісвацца нават не буду, але, будзьце ўпэўнены, у нашай краіне шмат хто хацеў бы атрымаць на яго адказ. Некаторы час таму да мяне на працы пачаў падыходзіць кіраўнік так званага "першага аддзела", а з ім і нейкі чалавек. Хутка высветлілася, што яны ад мяне хочуць — каб падпісаў паперу аб супрацоўніцтве з КДБ. Зразумела, што мне агідна ад самой прапановы. Але як выкруціцца так, каб з работы не звольнілі?

Без подпісу.

Праваабаронцы нагадваюць: паводле арт.22 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб Камітэце дзяржаўнай бяспекі" супрацоўніцтва грамадзян з органамі дзяржбяспекі будуецца выключна на добраахвотнай аснове. Гэта азначае, што ніхто не можа змушаць вас да такога супрацоўніцтва, вы ў любы момант можаце адмовіцца ад яго, падпісаныя вамі "заявы і абавязацельствы" вас ні да чаго не абавязваюць. Вы маеце права адмовіцца ад такога супрацоўніцтва, калі яно не з'яўляецца добраахвотным, бо яно такім чынам супярэчыць дзеючаму заканадаўству. "Акрамя таго, у мэтах вашай абароны ад далейшых настойлівых прапаноў супрацоўнікаў КДБ мы раім публічна агучваць праз СМІ спробы вашай вярбоўкі і ўціску з боку "чэкістаў", — гавораць праваабаронцы.

Вядома, супрацоўнікі органаў будуць абяцаць вам вырашэнне праблем з вучобай, гарантаваць вам, што вы не будзеце адлічаныя з ВНУ, але ўзамен яны будуць патрабаваць ад вас прадастаўляць інфармацыю пра вашых сяброў і знаёмых. Чым болей вы будзеце саступаць, тым болей яны будуць ад вас патрабаваць. Не ідзіце на змову з вашым сумленнем! Памятайце, што сённяшні КДБ лічыць сябе ідэйным і духоўным нашчадкам Фелікса Дзяржынскага — ката тысяч ні ў чым не вінаватых людзей! Падумайце, ці хочаце вы супрацоўнічаць з нашчадкамі НКВД?

Граждане вышли на пикет

В последнее время одной из наиболее распространенных форм гражданского самовыражения стали пикеты. Однако власти под любыми, часто надуманными, предлогами отказывают гражданам в реализации гарантированного Конституцией права на свободу пикетов (ст.35).

Как и в каком порядке можно использовать свое конституционное право?

Сергей КУНЦЕВИЧ.

Прежде всего необходимо ознакомиться с положениями Закона "О массовых мероприятиях в Республике Беларусь", который регулирует порядок организации и проведения различных общественных акций.

Практика показывает, что малейшие отступления инициаторов от требований этого Закона дают повод органам исполнительной власти для отказа в проведении такого мероприятия. В этой связи приведем один из недавних случаев.

Несколько жителей г.Кричева обратились в местный райисполком с ходатайством о проведении 23 марта с.г. пикета. Свое заявление они отправили по почте 7 марта (пятница), в райисполком оно поступило 10 марта (понедельник), и этим числом было зарегистрировано.

Согласно части 4 статьи 5 Закона "О массовых мероприятиях в Республике Беларусь", заявление подается в письменной форме не позднее чем за 15 дней до предполагаемой даты массового мероприятия.

Поскольку от 10 марта оставалось меньше 15 дней, то представители исполкома, используя ошибку заявителей, отказали им в проведении мероприятия.

Кто прав в этой ситуации? К сожалению, должны констатировать, что формально правы работники исполкома. Но заметим, что ничто не мешало заявителям отнести заявку непосредственно в канцелярию исполкома и зарегистрировать тем же 7-м числом.

Считаем важным обратить внимание на соблюдение и других требований, предъявляемых статьей 5 Закона к заявлению. В частности, необходимо точно определить цель, вид и место проведения мероприятия, а также время его начала и окончания.

В ходе проведения пикета следует точно соблюдать вышеуказанные позиции с целью обеспечения правовой безопасности организаторов и участников пикета.

В этой связи приведем еще один пример. Группа граждан из Новополоцка, несогласных с отменой льгот, проводили серию разрешенных пикетов. Они поставили целью привлечь внимание горожан к этой, как они считали, "антинародной акции". Однако в ходе пикетов организаторы начали дополнительно собирать подписи под обращением об отзыве депутатов Палаты представителей от Новополоцка, которые голосовали за отмену социальных льгот. Это привело к тому, что их привлекли к административной ответственности по статье 9.10 Кодекса об административных правонарушениях ("Нарушение законодательства о выборах, референдуме, об отзыве депутата и о реализации права законодательной инициативы граждан").

Защитить пикетчиков с точки зрения действующего законодательства было невозможно, поскольку они формально вышли за рамки объявленной в заявке цели.

В рамках данной публикации перечислить все требования к организации и проведению пикетов не представляется возможным. Перечень этих требований достаточно широк. Заявителям массовых акций можем только посоветовать перед подачей заявки основательно изучить сам закон и, конечно же, посоветоваться с юристами.

В заключение отметим, что возникновение большинства конфликтов между гражданами и чиновниками в сфере реализации конституционных прав происходит на почве чрезмерных ограничений в указанной сфере. Не является исключением и Закон "О массовых мероприятиях в Республике Беларусь" от 30 декабря 1997 г. (с последующими изменениями и дополнениями). Ряд его положений сводят на нет право на свободу мирных собраний, которое получило закрепление в ст.20 Всеобщей декларации прав человека, ст.21 Международного пакта о гражданских и политических правах. Как известно, Республика Беларусь обязалась соблюдать эти международные акты.

К тому же следует признать очевидное: Конституция имеет высшую силу по отношению к любым иным законодательным актам. Это значит, любой нормативный акт не может противоречить Конституции и тем более ухудшать правовой статус граждан. Следовательно, путем издания законов, как и подзаконных актов, нельзя вводить дополнительные ограничения в сфере свободы гражданского самовыражения.

В этой связи мы убеждены, что существующий разрешительно-запретительный порядок организации и проведения общественных акций должен быть заменен на уведомительный, каковой существует во всех европейских странах. Соответственно должен быть разработан более либеральный закон о порядке проведения общественных акций. Но это -- дело будущего, а пока приходится жить по тем законам, которые есть.

Михаил ПАСТУХОВ,
Юрий ТОПОРАШЕВ,
юристы общественного объединения "Белорусская ассоциация журналистов".

СМЕХАТУРА!

Спадару Лябедзьку пашанцавала

Трымаю ў руках адзін з нумароў "Народнай волі". На першай старонцы ксеракопія пашпарта спадара Лябедзькі. На ўвесь ліст штамп: "У выезде адказана", і дата 04.02.2008. Тое, што гэта не фотамантаж, а сапраўднае пацвярджэнне факта, паверыў толькі пасля тэлефанавання ў рэдакцыю "Народнай волі".

Ну што тут скажаш? Спадару Лябедзьку вельмі пашанцавала, бо ён стаў уладальнікам унікальнага дакумента, каштоўнасць якога з гадамі будзе расці і расці. Ну хто паверыць гадоў праз 20—30, што на пачатку XXI стагоддзя Беларуссю кіравалі людзі, якія нават не ўмелі без памылкі пісаць. Па-беларуску не "адказана", а "адмоўлена". Словазлучэнне "ў выездзе" пішацца праз "дз". Суцэльная неадукаванасць! На Беларусі такіх завуць проста — дурні. А тут дакумент! І яго ўжо не абвергнеш.

На жаль, гэта не адзіны выпадак здзеку з роднай мовы. Гэта толькі на паперы яна дзяржаўная. З дзяржаўных людзей ведаю толькі двух, якія ў публічных спрэчках ці падчас інтэрв'ю размаўляюць па-беларуску. Гэта вядомы дырыжор, сенатар Міхаіл Фінберг і пасол Павел Латушка. Хаця, згодна з "Законам аб дзяржаўнай службе", у службовы абавязак кожнага дзяржслужачага ўваходзіць веданне кожнай з дзяржаўных моў Рэспублікі Беларусь. Але ж, на жаль, мы ўжо больш як 10 год жывём не па законах, а "по понятиям". А яны, "понятия", не такія ўжо і складаныя: "была б чарка ды скварка", а ўсё астатняе нас не хвалюе. А таму ад аднаго чуеш, што Скарына працаваў у Санкт-Пецярбургу, а Быкаў — паэт, ад другога, што Іран — "сторона в Саудовской Аравии" і гэтак далей... аж да "рохкаць ля карыта".

Беларускія чыноўнікі на скаргу аб парушэнні правоў на свабоднае выкарыстанне беларускай мовы ў якасці мовы зносін, могуць адказаць лістом на рускай мове, і пры гэтым сцвярджаць, што правы беларускамоўнага грамадзяніна не парушаны. Спасылаюцца на тое, што ў нас, бачыш ты, дзвюхмоўе, і кожны мае права выбіраць мову зносін. Але я мовай зносін выбраў родную мову. І чаму чыноўнік, які жыве за кошт падаткаплацельшчыкаў, ігнаруе маё права?

Зараз паўсюль павысіліся патрабаванні да прафесійнай падрыхтоўкі работнікаў усіх спецыяльнасцяў. А вось на дзяржаўную службу можна трапіць без ведання дзяржаўнай беларускай мовы, пракурорам, аказваецца, можна стаць без вышэйшай юрыдычнай адукацыі...

"Народная воля" шмат матэрыялаў прысвячае стану беларускай мовы ў нашай краіне. За што Вам вялікі дзякуй!

Аляксандр Віктаравіч СТАНКЕВІЧ.

Гомель.

МЕРКАВАННЕ

Усе вызвольныя рухі ставіліся да галадоўкі як да святога

Я не вывучаў пытанне пра галадоўку як форму мірнага супраціву тыраніі адмыслова. З літаратуры ведаю, што да гэтай формы пратэсту супраць здзеку з правоў чалавека звярталіся вязні царскіх турмаў. Нам, беларусам, памятная галадоўка 1903 г. у знакамітай пецярбургскай турме "Кресты", бо ў ёй браў удзел адзін з пачынальнікаў нашага нацыянальна-вызваленчага руху Іван Луцкевіч. Некаторыя схіляюцца да думкі, што менавіта ў "Крестах" Іван Луцкевіч падарваў сваё здароўе і што менавіта гэта абумовіла яго раннюю — у 38 гадоў — смерць.

Нам вядомыя галадоўкі індыйскіх патрыётаў, якія пад кіраўніцтвам Махандаса Карамчанда Гандзі змагаліся супраць брытанскага панавання. У пасляваенны час мы былі сведкамі трагедыі паўночнаірландскага патрыёта Роберта (Бобі) Сэндса (ён памёр на 65-я суткі галадоўкі) і 9 ягоных таварышаў. Па "галасах" мы чулі пра галадоўку акадэміка Андрэя Сахарава, сасланага ў г.Горкі (Ніжні Ноўгарад), і пра тое, як яго гвалтам кармілі пры дапамозе шланга.

Беларуская рэчаіснасць лукашэнкаўскага перыяду прымусіла трымаць галадоўку вязняў Юрыя Хадыку і Вячаслава Сіўчыка. Гэтая акцыя пратэсту была паспяховая: абодва вязні "Валадаркі" выйшлі на волю. Каб прадухіліць галадоўку групы дэпутатаў Вярхоўнага Савета Беларусі 12-га склікання, Лукашэнка і яго памагатыя ўжылі гвалт да народных абраннікаў. Мы ведаем, што ў 1999 годзе ў ізалятары на вуліцы Акрэсціна трымаў галадоўку і супраціўляўся гвалтоўнаму кармленню Віктар Ганчар. Няма сумневу, што мужныя паводзіны В.Ганчара шмат у чым прадвызначылі яго трагічнае "знікненне". Сваёй 53-дзённай галадоўкай Аляксандр Казулін дамогся таго, што аб праблеме правоў чалавека ў Беларусі загаварылі на ўзроўні Савета Бяспекі ААН.

Усе вызвольныя рухі ставіліся да галадоўкі як да святога (sacrum). Галадоўкі пачыналіся з сур'ёзнымі мэтамі і намерамі; яны, як правіла, былі працяглыя. Галадоўкі часцей за ўсё праводзіліся ў вязніцах або ў публічных месцах. Гэта прадухіляла ўсякую магчымасць інсінуацый у дачыненні да галадоўшчыкаў з боку уладаў. Гэта прымушала ўлады або ісці на саступкі ўдзельнікам акцый, або ўжываць да іх гвалт. Гэта не давала мяшчанам магчымасці кпіць з галадоўшчыкаў і распаўсюджваць пра іх усякія байкі.

У 2006 г. мы сутыкнуліся з новай з'явай. Нехта (гэта былі, здаецца, маладыя палітыкі з сацыял-дэмакратаў) прыдумаў эстафетную галадоўку. Чалавек колькі там дзён галадае, за ім другі, за другім трэці...

Я ведаю галадоўкі, разлічаныя на некалькі дзён (часцей за ўсё на тры). Іх практыкуюць хрысціяне, асабліва перад Пасхай. І называюцца яны шчырым постам. Пост гэты дапаўняецца малітвамі. Бывае, што хрысціяне па некалькі дзён жывуць на адной вадзе, посцячы ў нейкай інтэнцыі. Так, маці беларускай патрыёткі Надзеі Дземідовіч некалькі гадоў нічога не ела па серадах і пятніцах, малілася, каб яе дачка вярнулася з ГУЛАГа, і Бог даў ёй пабачыць дачку на волі.

Хрысціяне, посцячы і молячыся, у адпаведнасці з Хрыстовым прыказаннем не робяць гэта публічна. Нашы ж эстафетныя галадоўшчыкі выстаўляюць сябе напаказ.

Сёлета зноў абвешчана эстафетная галадоўка. Мэты гэтай эстафетнай галадоўкі заяўлены сур'ёзныя, але форма і тэрміны яе правядзення аніяк не трывожаць уладу, даюць уладзе і грамадзянам (не абавязкова мешчаноце) падставы для кепікаў. Месцы правядзення эстафетнай галадоўкі ("каля халадзільнікаў", як жартуюць дасціпнікі) таксама не надаюць ёй грамадскай вагі. Эстафетным галадоўшчыкам відавочна нестае мужнасці Юрыя Хадыкі і Вячаслава Сіўчыка, Віктара Ганчара і Аляксандра Казуліна. Але самае галоўнае тое, што форма, тэрміны і месцы правядзення эстафетнай галадоўкі зніжаюць sacrum да profanum.

Трэба ў ветлівай форме папрасіць эстафетных галадоўшчыкаў спыніць прафанацыю галадоўкі як сродку мірнага пратэсту і супраціву тыраніі.

Анатоль СІДАРЭВІЧ.

ПРОБЛЕМА

«Чем больше узнаю людей, тем больше нравятся собаки»

С февраля этого года объектом повышенного внимания со стороны властей Минска стали владельцы собак. Причем и те, у кого просто живет четвероногий друг, и те, кто использует их в предпринимательской деятельности, — в равной степени.

Перечень из 40 "потенциально опасных пород собак" утвержден постановлением Министерства сельского хозяйства и продовольствия, по-видимому, самого крупного специалиста в собачьем вопросе. И в этот весьма эксклюзивный документ, кроме абсолютно не известных широкому кругу узких специалистов пород: айну, акабаш, анатолийский карабаш перро де пресо канарио, кангал (прошу не путать с мангалом), капе-норсо, маремма, терро де мальоркин, тоса-ину, филе бразильеро, — включены и такие, которые на слуху. Это два вида гончих и пастушьих собак, ризенштауцер, все овчарки и... шарпей. Последний по своим повадкам больше напоминает кошку, нежели является китайской бойцовой собакой, и способен лишь зализать до смерти.

Тем не менее министерство обязало всех владельцев, "имеющих собак потенциально опасных пород, в 3-месячный срок пройти специальные курсы в кинологических клубах для получения удостоверения (справки) о порядке разведения, содержания и ухода за собаками". И это — независимо от возраста, инвалидности и общего состояния здоровья животного.

Налог на непорочную любовь определен государством в зависимости от... базовой величины. И на сегодняшний день составляет 45.500 рублей ежемесячно. Но будет расти и дальше вместе с той самой величиной.

За что же конкретно вынуждены платить владельцы собак такие БЕШЕНЫЕ деньги? РСЦ по Первомайскому району, взыскивая их, не смогло предоставить мне эту информацию, хотя я обращалась трижды. Но все-таки я нашла нужную информацию. Ежемесячно хозяева собак должны отстегивать более 22.000 рублей на отлов бродячих животных, почти 16.000 рублей — на содержание приютов для собак, которые никто из нас не брал обязательства содержать. (Я, например, считаю, что, напротив, это государство должно доплачивать мне за собаку, которую я подобрала и пригрела в своем мини-приюте.) Следующие около 5000 идут на строительство площадок для выгула собак. Которые если где и имеются по недоразумению, то не отвечают необходимым требованиям. И это при том, что деньги на их постройку взыскиваются с собачников уже неимоверное количество лет.

Наконец, следующие более 2000 рублей идут на регистрацию собак в ЖЭС. Как будто они регистрируются ежемесячно.

У нас в доме есть жилец, который за свою однокомнатную квартиру платит 43.451 рубль, я в тот же месяц за собаку заплатила 45.500 рублей! Разве это не абсурд?! Даже машина владельцу, несмотря на ее чрезмерную потенциальную опасность (с налогом на экологию, дороги и даже техосмотр) обходится из расчета на месяц в 22 раза дешевле собаки. Не потому ли, что чиновники предпочитают обзаводиться машинами, а не собаками, ибо кроме себя и своих "железных леди" никого на свете не любят?! Для сведения: в дорожных авариях погибает людей больше, чем на войне. И эти цифры никак не сравнимы с количеством пострадавших от собак.

По какому же праву налог на отлов и содержание бездомных животных взыскивается в принудительном порядке именно с тех, кто и так содержит животных? Иногда из милости...

Я могу жить без необходимого, но не могу без лишнего. У меня, например, много лет нет телевизора. Зато есть старенькая и крайне больная собака породы доберман, подобранная из жалости. У нее рак грудных желез, астма, сердечно-сосудистая недостаточность, артрит и масса других заболеваний. Она ходит под себя, когда не в состоянии встать, ест с ложки и по причине энуреза просится на улицу до трех раз за ночь. Ей тринадцатый год, что в переводе на человеческий возраст — порядка 90 лет. Людей обходит стороной всю сознательную жизнь и не вступает в конфликты с другими животными. И тем не менее некто определил, что она представляет собой "потенциальную опасность". Может быть, наоборот, потенциально опасны для общества те люди, кто принимает подобные решения? Ведь подобными налогами они просто провоцируют появление на улицах городов и поселков стай бездомных животных.

Тамара ГУЛЕЗОВА.

P.S. *Пока это письмо готовилось к печати, собака нашей читательницы — автора письма умерла. Это, однако, не избавило хозяйку от необходимости заплатить за прошлый месяц действительно огромный налог, в 45.500 рублей.*

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

СКАНДАЛЫ

Премьер уходит в отставку

Премьер-министр Ирландии Берти Ахерн объявил о намерении покинуть свой пост 6 мая этого года. Отставка премьера связана с разгоревшимся в Ирландии коррупционным скандалом.

Ахерна, в частности, подозревают в получении взяток в 1990-х годах. Глава правительства отверг обвинения, заявив, что он "хоть и совершал ошибки, но никогда не позволял себе обогатиться за счет злоупотребления доверием". Ахерн также отметил, что отставка с поста премьер-министра станет лучшим выходом из сложившейся ситуации и пойдет во благо всей страны, подчеркивает Би-Би-Си.

Ахерн возглавлял ирландское правительство с 1997 года. Из своих 56 лет он 31 год был депутатом ирландского парламента. С 1994 года он возглавлял партию "Фианна файл", в настоящее время входящую в правящую коалицию. Под его руководством партия трижды побеждала на выборах. Такого успеха, помимо него, добивался только один из отцов-основателей Ирландской республики Имон де Валера.

По длительности правления на посту премьер-министра Ахерн также идет вторым после де Валеры. Его нынешний срок формально заканчивается в 2012 году.

Главным достижением Ахерна считается его активная роль в переговорах в Северной Ирландии, которые завершились подписанием мирного Соглашения в 1998 году. Был момент, когда он уехал с похорон матери из-за того, что переговоры потребовали его срочного вмешательства.

Однако недавно трибунал, расследующий обвинения в коррупции, занялся личными финансовыми делами Ахерна. Он попытался опротестовать право трибунала заниматься его личными делами. Но затем премьер сказал, что уходит досрочно, чтобы тяжба не отвлекала от работы других членов правительства. "Поразмыслив о необходимости не допустить, чтобы моих коллег-министров отвлекала от работы шумиха, связанная с трибуналом, я по собственной воле решил уйти в отставку раньше срока. В глубине души я твердо знаю, что ничего плохого не сделал", — объявил Ахерн на пресс-конференции.

ФОТОВЗГЛЯД

"Давайте встретимся в НАТО!"
Вот так Лора Буш пыталась оттащить своего мужа, президента США, от Катерины Ющенко, супруги президента Украины.

Не ожидал.
Александр Стубб неожиданно возглавил финский МИД; его предшественника уволили из-за SMS-сообщений танцовщице эротического шоу.

УРОКИ ИСТОРИИ

Почему Сталин отказался от «плана Маршалла»?

В начале апреля исполнилось 60 лет со дня начала осуществления "плана Маршалла", названного так в честь тогдашнего госсекретаря США. Этот план был нацелен на восстановление послевоенной Европы.

Маршалл предложил присоединиться к этой инициативе и Советскому Союзу, но Сталин ответил отказом. Если бы принял, то уровень жизни на востоке Европы был бы таким, как и на Западе.

Весной 1945 года некогда процветающая Европа лежала в руинах: население многих стран голодало, промышленность была разрушена. В 1947 году госсекретарь Джордж Маршалл представил свой план реконструкции Европы, в основу которого была положена идея свободной торговли. Европейцы должны были сами выработать детали плана, Соединенные Штаты обязались его финансировать.

"План ставил целью увеличить объем торговли и инвестиций, более тесно связав друг с другом Соединенные Штаты и европейские страны", — отмечает вашингтонский историк Мауро де Лорензо.

Расчетная смета инициативы превышала 1% внутреннего валового продукта Америки и противники били тревогу, что это серьезно подорвет экономику США.

"Соединенные Штаты, — говорит вашингтонский профессор Анжела Стент, — опасались, что из-за разрухи в западной части Европы коммунизм распространится на весь континент со всеми вытекающими отрицательными последствиями для их безопасности".

Вашингтон предложил СССР присоединиться к "плану Маршалла", но Сталин это предложение отверг и принудил к этому же своих восточно-европейских сателлитов.

"Принять предложение США, — продолжает профессор Стент, — значило для Сталина, во-первых, признать, что СССР нуждается в американской помощи, а во-вторых, реально подпустить американцев к святая святых механизма принятия политико-экономических решений в Кремле и раскрыть им подлинную картину ситуации в стране". Поэтому реакция Сталина была вполне объяснима, добавляет Стент.

"Влиятельные на тот момент коммунистические партии Италии и Франции, — говорит она, — получили от Москвы задание организовать массовые акции протеста против "плана Маршалла" и изобразить его как интригу американского империализма, рассчитанную на подрыв суверенитета европейских государств".

Из 16 получателей помощи по линии "плана Маршалла" самыми крупными были Великобритания, Франция и Западная Германия. Спустя два года после запуска плана и всего 5 лет после окончания войны ВВП Западной Европы поднялся фактически до предвоенного уровня, а объем промышленного производства даже превышал довоенный на 15%.

Успех "плана Маршалла", по мнению некоторых экспертов, дает основание полагать, что такой же по масштабам проект мог бы вытащить из нищеты страны черной Африки и СНГ. Однако господствующая на сегодня точка зрения сводится к тому, что "план Маршалла" состоялся не только ввиду крупной внешней помощи, но и по причине наличия в Европе правовых и социальных предпосылок для "экономического чуда", заключает "Голос Америки".

У СОСЕДЕЙ

У Литвы новый спикер

Сейм Литвы выбрал нового спикера взамен отправленного в отставку Викториаса Мунтянаса. Председателем парламента стал представитель правящей Социал-демократической партии Чесловас Юршенас.

Юршенас, как отмечает РИА Новости, окончил Высшую партийную школу в Ленинграде, впоследствии он заведовал в литовской компартии сектором по печати, радио и телевидению.

После развала СССР он стал депутатом сейма Литвы и сохранил свой мандат во всех последующих составах парламента. Несколько раз Юршенас занимал пост спикера, в последнее время работал заместителем председателя парламента.

Прежний спикер Викторас Мунтянас, представлявший Партию гражданской демократии, подал в отставку, после того как оказался под подозрением во взяточничестве. Поводом для скандала стала пленка, на которой председатель парламента передает деньги чиновнику Каунасского уезда.

Мунтянас пояснил, что действовал по поручению своего родственника, а деньги предназначались за проектировочные работы при разделе земельного участка. Он признал свои действия ошибочными, однако обвинения в коррупции отверг. Сейм принял его отставку.

Новые столкновения в Тибете

Из Тибета пришли сообщения о новых беспорядках. Как сообщает Си-Эн-Эн, в столкновениях на границе с провинцией Сычуань погибли 8 человек.

Сотни монахов атаковали правительственные здания, требуя освободить двух тибетцев — их якобы арестовали за хранение портрета Далай-ламы. В Пекине информацию о жертвах не подтверждают. Как передает агентство Синьхуа, власти лишь стреляли в воздух, чтобы остановить натиск активистов.

Массовые беспорядки вспыхнули в Тибете месяц назад. Сотни людей вышли на улицы Лхасы, требуя независимости для Тибета. В итоге в столкновениях с китайскими властями, по разным данным, погибли от 20 до 140 человек, передает НТВ.

КАЛЕЙДОСКОП

Отбил жену у крокодила

Австралиец вышел победителем в короткой схватке с крокодилом, который пытался утащить его жену.

Драма развернулась в национальном парке Личфилд вблизи города Дарвин на севере Австралии. Крокодил неожиданно бросился на женщину, которая стояла на берегу реки, ухватил ее за ноги и пытался утащить в воду.

По мнению полицейских, она осталась в живых только благодаря героическим действиям своего мужа, который не растерялся в сложной ситуации. Он прыгнул на спину крокодила и руками закрыл ему глаза, пытаясь заставить его выпустить женщину из пасти. Крокодил изо всех сил сопротивлялся, но потом в конце концов сдался. 36-летняя женщина получила серьезные травмы, и ей предстоит операция в Дарвине. Ее геройский супруг не пострадал.

Конкурс верблюжьей красоты

Десять тысяч верблюдов приняли участие в уникальном Международном конкурсе красоты, который проводился в Объединенных Арабских Эмиратах. Строгое жюри отобрало самых лучших верблюдов в каждой возрастной группе, проверив их на чистоту кровей, отсутствие болезней и серьезных изъянов.

Конкурс в Абу-Даби является одним из самых роскошных и крупных мероприятий подобного рода. На нем разыгрываются призы на сумму, превышающую 9 млн долларов, а также 100 автомобилей. В конкурсе приняли участие верблюды из Бахрейна, Кувейта, Омана, Катара и Саудовской Аравии. Организаторы хотели этим мероприятием напомнить своим жителям о традиционных ценностях пустынной жизни.

После 50-летнего ухаживания

97-летняя француженка решила выйти замуж за своего 101-летнего итальянского ухажера, с которым она встречается уже около 50 лет, передают французские СМИ.

Пара подала документы в итальянский загс и ожидает, что церемония свадьбы пройдет еще до начала лета.

У немолодой пары за всю историю отношений никогда не получалось оставаться вместе на долгое время: до 75 лет оба работали в разных городах, а после свиданиям мешали расстояния и большие семьи влюбленных. Мадам Сильви Базан работала и жила в Монако, ее поклонник — в Италии. Они были вынуждены ограничивать свои отношения выходными и совместными отпусками.

Впрочем, обоих такая ситуация устраивала и жениться они не собирались. Лишь достигнув солидного возраста, пара решилась на важный шаг.

Долгожительство французов эксперты объясняют развитием медицины. Родившиеся в начале прошлого века в деревнях - "поколение био" — смогли прожить до глубокой старости благодаря правильному уходу, своевременной диагностике и лечению болезней.

Столетние французы, впрочем, лишь подтверждают общую тенденцию увеличения продолжительности жизни. Сейчас она более 81 года, причем женщины живут дольше мужчин: 84,5 года против 77,6.

Прикинулся покойником

Вору, пытавшемуся ограбить похоронное бюро в одном из испанских городов, не удалось обмануть полицию, прикинувшись мертвецом, сообщает АР.

24-летний преступник проник в похоронное бюро в городе Бурхасот, расположенном около Валенсии. Жители соседних домов заметили, что дверь бюро взломана, и вызвали полицию.

Когда представители правоохранительных органов прибыли на место происшествия, вор не успел сбежать и решил притвориться мертвецом. Он забрался в застекленное помещение, где выставляются тела усопших во время ритуальных церемоний, и лег на специальный постамент. Однако полиция быстро разоблачила подлог. Для "покойника" он был слишком неопрятно одет. Кроме того, при ближайшем рассмотрении выяснилось, что он дышит.

Полицейские рассказали, что задержанный ранее уже арестовывался за кражи. Владельцы похоронного бюро в свою очередь рассказали, что никогда не хранили в этом помещении каких-либо ценностей и не понимают, почему грабитель забрался именно к ним.

ВАС ЦІКАВІЦЬ...

Беларускае тэлебачанне паказала сюжэт пра сустрэчу Аляксандра Лукашэнкі з англічанінам Цімаці Бэлам. Як я зразумела, гэтаму бізнесмену даручана паляпшаць імідж Беларусі на міжнародным узроўні. А хто гэты чалавек, што пра яго вядома?

Вера Мяснікова, г.Брэст.

Цімаці БЭЛ:

Калі мэта — уводзіць людзей у зман, я не стану гэтым займацца

Так сказаў Цімаці Бэл, сусветна вядомы піяршчык, якога наняў Лукашэнка для паляпшэння іміджу краіны ў Еўропе. Нам падалося, што ягонае інтэрв'ю часопісу "Профиль" цікавае.

— Адно брытанскае агенцтва зняло фільм "Смерць нацыі" для Брытанскага тэлебачання. Ён прысвечаны справам у сучаснай Расіі. У фільме Расію сімвалізуе паранены мядзведзь, які памірае і паўзе па заснежаным пасткавым полі. Сыходзячы ад адной пасткі, мядзведзь трапляе ў іншую. Ці супадае гэты імідж з тым, што вы думаеце пра Расію?

— Зусім не. Расія была канаючым мядзведзем, але пасля перабудовы — гэта жывы мядзведзь, які змагаецца за сваё месца ў лесе. Відавочна, што Расія — адна з ключавых краін з агромністымі рэсурсамі, у тым ліку і чалавечымі. Рускія вельмі таленавітыя і адукаваныя людзі. Але дэмакратыя ў Расіі, толькі нарадзіўшыся, праіснавала зусім нядоўга.

— Імідж краіны — паняцце даволі размытае. Што гэта — УВП, інвестыцыйны клімат, духоўныя каштоўнасці? Ці наогул існуюць крытэрыі?

— Ва ўспрыманні людзей усе краіны дзеляцца на тры катэгорыі: 1) добрыя хлопцы; 2) кепскія хлопцы; 3) невядома якія хлопцы. Чаму краіна трапляе ў тую ці іншую катэгорыю, залежыць шмат ад якіх фактараў. Але ёсць імідж, які дамінуе, архетып краіны. Напрыклад, калі мы кажам Францыя, першае, што прыходзіць да галавы, — мода, рамантыка, французская кухня. Італія — футбол, Амерыка — памер, улада і багацце. Я думаю, што сёння заходні еўрапеец не ведае дакладна, што такое Расія. Таму што сама Расія да канца гэтага не ведае.

— Што ў ідэале павінен рабіць урад любой краіны для стварэння пазітыўнага іміджу?

— Я не выкарыстоўваю слова "імідж", я працую над "рэпутацыяй". Перш за ўсё трэба вызначыцца з мэтай. Калі краіна хоча палепшыць сваю рэпутацыю, для пачатку трэба зразумець: палепшыць ад чаго да чаго.

Мой алгарытм працы такі. Я пачынаю з агляду сітуацыі на дадзены момант: дзе знаходзімся, чаго хочам дасягнуць. Гэта адразу вызначае, якую рэпутацыю краіна хоча зарабіць у іншай краіне ці рэгіёне, у краіне з дэмакратычным праўленнем ці з дыктатурай. Гэта ўжо тэхналогія: як зарабіць рэпутацыю ў розных краінах. Галоўнае — зразумець, чаго ты хочаш і якімі сродкамі хочаш дасягнуць мэты. Далей я раблю ацэнку цяперашняй рэпутацыі краіны. Любая рэпутацыя — гэта тры кампаненты: што ты робіш, што ты кажаш пра тое, што ты робіш, і што пра гэта кажуць іншыя.

— І як вы ацэньваеце палітыку Расіі па выбудове яе іміджу за межамі?

— Шчыра кажучы, не ведаю, ці ёсць у Расіі такая палітыка. Па тым, што я бачу, пра гэта меркаваць немагчыма. Ёсць нейкія кароткатэрміновыя праекты, як, напрыклад, саміт Вялікай васьмёркі. Але мне незразумела, якой рэпутацыі хоча для сябе Расія ў доўгатэрміновай перспектыве. Калі яна хоча мець пазітыўны імідж, навошта тады прыпыняць пастаўкі нафты ў Еўропу, газу ва Украіну, высылаць грузін? Як падобнымі захадамі можна стварыць пазітыўны імідж?

— Брытанскія СМІ цяжка падкупіць, але ім заўжды можна прадаць цікавую гісторыю. Што вы і зрабілі віртуозна з гісторыяй атручэння Літвіненкі. Такой пільнай увагі брытанскія СМІ не праяўлялі ні да адной персоны з часоў смерці прынцэсы Дзіяны. Некаторыя расійскія СМІ нават прыпісалі вам аўтарства перадсмяротнага паслання Літвіненкі, дзе ён абвінавачвае прэзідэнта Пуціна ў сваім атручэнні.

— Я ў курсе, што пішацца пра мяне ў расійскіх СМІ, але мяне гэта не хвалюе. Ніхто з расійскіх журналістаў не звярнуўся да мяне па каментарый, па ўдакладненне фактаў, уся іх інфармацыя не з першых рук. Мая роля ў гэтай справе простая: жонка Літвіненкі, Марына, папрасіла маё агенцтва зрабіць фотаздымак Аляксандра ў бальнічнай палаце. "Я хачу, каб свет пабачыў, што яны зрабілі з маім мужам", — сказала Марына. Здарылася так, што фотаздымак, які мы зрабілі, захапіў не толькі брытанскія, але і сусветныя СМІ. Другое, што я зрабіў, пабачыўшы, які ажыятаж усё гэта выклікала, — прапанаваў Марыне паслугі сваёй кампаніі. Такім чынам, мая кампанія стала пасярэднікам паміж сям'ёй Літвіненкі і журналістамі. Усе запыты ад брытанскіх і сусветных СМІ прыходзілі да нас, а мы ўжо давалі парады, каму даваць інтэрв'ю, і г.д. Я не магу сказаць, што Аляксандр быў маім сябрам. Я бачыў яго некалькі разоў. Проста мне стала па-чалавечы шкада сям'ю, на якую абрынулася такое гора, і пры гэтым ім бы кожную хвіліну званілі журналісты.

Усё гэта было зроблена абсалютна бясплатна.

— Вы адмаўлялі каму-небудзь, хто звяртаўся да вас з просьбай папрацаваць над іміджам чалавека, кампаніі ці краіны?

— Я заўжды адмаўляў тым, каму не змог бы дапамагчы. Напрыклад, з-за таго, што не падзяляю іх прынцыпаў.

— Калі б цяперашнія расійскія ўлады прапанавалі вам папрацаваць над іміджам Расіі за межамі, вы б пагадзіліся?

— Гэта б цалкам залежала ад іх мэтаў. Калі іх мэты — уводзіць людзей у зман, я б не стаў гэтым займацца. Калі мэта — навесці масты з заходнім светам на карысць расійскіх грамадзян, тут я быў бы рады дапамагчы.

— Вы доўга працавалі з Тэтчэр, праводзілі яе перадвыбарныя кампаніі, раілі не толькі, як камунікаваць з журналістамі, але і як апранацца. Аднойчы вы сказалі, што "для Маргарэт гатовы на ўсё". Чаму яна стала вельмі важным чалавекам у вашым жыцці?

— Маргарэт была маім блізкім сябрам. Яна сфармулявала для мяне тое, у што я веру. Дэмакратыя і прыватнае прадпрымальніцтва. Яна вызваліла Англію ад прыгнёту сацыялізму. Я ганаруся ёю. Яна натхніла брытанцаў на разуменне сапраўднага значэння слова "дэмакратыя", навучыла браць ініцыятыву ў свае рукі, раздзяржавіла бізнес. Зрабіла шмат для таго, каб брытанцы адчувалі сябе годна. Яна да цяперашняга часу мяне натхняе.

— Апроч грошай, што падштурхоўвае вас працаваць?

— Ды калі б я працаваў толькі з-за грошай, то быў бы значна больш багатым. А я зусім не багаты. Я хачу, каб праца прыносіла мне прафесійнае задавальненне і самапавагу. Часам я бяруся за працу з сімпатыі да чалавека ці ідэі, як гэта, напрыклад, было ў выпадку з Юшчанкам. Я глыбока веру ў дэмакратыю і ў прыватны, а не ў дзяржаўны бізнес, таму мне было б цікава працаваць на здзяйсненне "аранжавай рэвалюцыі". Тое, што там адбылося пасля, — ужо іх унутраныя справы. У сваёй працы я не расчараваны.

— Вы прафесійна працуеце над іміджам і рэпутацыяй краіны. Вашу ўласную рэпутацыю, напэўна, часткова ствараюць тыя, на каго вы працуеце. Наколькі яна вам дарагая?

— Мая ўласная рэпутацыя складаецца з тых жа трох кампнентаў, пра якія я казаў. Канешне, я хачу глядзець у люстэрка так, каб мне не было брыдка за чалавека, на якога я гляджу. І мне не брыдка. Я паважаю сябе.

ДА ВЕДАМА

Цімаці Бэл — былы дарадца Маргарэт Тэтчэр па PR і заснавальнік "Бэл Пацінгер Груп", лорд, адзін з самых віртуозных "піяршчыкаў" Вялікабрытаніі.

У сакавіку 2004 г. фірма Bell Pottinger — даччыная кампанія Chain Communications — атрымала ад урада кантракт на кампанію па прамоўцыі дэмакратыі ў Іраку пасля падзення рэжыму Хусейна. Асноўным мэсэджам кампаніі было тое, што дэмакратыя — гэта "шлях да міру і росквіту. Кампанія Бэла ў Іраку ўключала розныя кірункі: тэлебачанне, прэсу, вонкавую рэкламу, улёткі і нават сустрэчы гарадскіх саветаў. Пры гэтым асноўную працу на месцы выконвалі арабскія партнёры Бэла, у той час як ідэі для кампаніі ствараліся ў Лондане. Рэкламныя ролікі, створаныя Бэлам, прапагандавалі ідэю "важнасці ўдзелу ў дэмакратычным працэсе і спадзяванні на лепшую будучыню, якую можа прынесці ў Ірак дэмакратыя".

У інтэрв'ю тэлебачанню Бі-Бі-Сі спадар Бэл падкрэсліў, што ідэя прапаганды дэмакратыі не ў тым, каб прадаваць яе як "прадукт", а ў тым, каб "інфармаваць людзей пра крокі, якія трэба рабіць падчас пераходу да дэмакратыі".

Між тым стала вядома, што Bell Pottering адмовіла прэзідэнту Зімбабве Роберту Мугабэ, які звярнуўся да агенцтва з просьбай зрабіць "піяр-кампанію" сваёй краіне. Нагадаем, што міжнародная супольнасць лічыць зімбабвійскі рэжым дыктатурай, а сам спадар Мугабэ вядомы рэзкай антызаходняй пазіцыяй і жорсткімі рэпрэсіямі ўнутры краіны. Як патлумачыў спецыяльнай камісіі брытанская парламента кіраўнік Bell Pottering Пітэр Бінгль, "нам пазванілі з Зімбабве з просьбай аказаць ім кансультацыйныя паслугі, але мы сказалі — не, дзякуй. Калі б нехта ўзяўся за такую кампанію, яна была б вельмі шкоднай і небяспечнай".

Якім чынам Бэл трапіў да беларускага прэзідэнта - невядома. Але на гэтай сустрэчы па правую руку ад Аляксандра Лукашэнкі сядзела намеснік кіраўніка прэзідэнцкай Адміністрацыі, былы прэс-сакратар Наталля Пяткевіч.

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

Галіна Пазьняк

Беларусь у сэрцы

(Працяг. Пачатак у №№7—10, 13—14, 17—18, 21—22, 25—26, 29—30, 33—34, 37—38, 41—42, 45—46, 49—50.)

САКАВІК-96

24 сакавіка 1996 г. на плошчы каля Опэрнага тэатру адбыўся вялікі мітынг БНФ. Пасьля прамоваў была прынятая рэзалюцыя: ісьці ўсёй грамадой да тэлецэнтра (Круглая плошча) і патрабаваць непасрэдны эфір. Калі вялікая дэманстрацыя падышла да тэлецэнтру, у будынак ТБ для перамоваў пайшлі дэлегаваныя Зянон Пазьняк і Павел Знавец (дэпутат Вярхоўнага Савета). Поўная плошча перад тэлецэнтрам і ўся прастора была запоўнена людзьмі. Мы чакалі.

Раптам зьявіліся амапаўцы ў касках-шлемах, са шчытамі і пачалі груба рассякаць людзей. Людзі супраціўляліся і шчыльней сталі адзін да другога. Многія счапіліся пад рукі. Утварылася нейкае агульнае "цела" натоўпу, якое ў выніку жорсткіх дзеяньняў амапаўцаў загойдалася спачатку ў адзін, затым у другі бок, потым пачало разгойдвацца.

Я стаяла ў самай гушчы перад прыступкамі ТБ. Раптам мяне сьціснула так, што я ледзь ня страціла прытомнасьць. Здалося, што ўжо ня выберуся з гэтага вялікага "цела". Стала страшна, як перад сьмерцю. І раптам нечая моцная рука пацягнула мяне і вырвала з таго месца, дзе я ўжо ледзь не асела пад ногі шчыльна стаяўшых людзей. Нечыя добрыя рукі цягнулі мяне, і людзі стараліся даць мне магчымасьць праціснуцца. Мяне ведалі і пазнавалі як жонку Зянона Пазьняка і прапіхвалі на край, ратавалі.

Я так і ня ведаю, хто вырваў мяне зь людзкой гушчы. Дужыя рукі выштурхнулі мяне зь небясьпечнага месца і зьніклі.

Мы з Галяй Дзягілевай праціснуліся на прыступкі ТБ. Вакол тварылася злачынства: людзей груба штурхалі, білі, піхалі з плошчы, жорстка "расьсякалі". Але людзі не здаваліся. Нас з Галяй таксама пачалі выцясьняць. Тут я ўбачыла У.Ярмошына. Ён быў у чорнай скуранай куртцы. Побач зь ім былі яшчэ людзі, але тут кіраваў Ярмошын. Ён аддаваў загады рубленымі фразамі. Выгляд у яго быў жорсткі, злосны і рашучы. Я добра запомніла яго бязьлітасны твар, калі сутыкнулася зь ім. На імгненьне мне падалося, што ён прыйшоў з таго страшнага часу, з Губчэка. Уся ягоная постаць нагадвала клясычнага энкэвэдзіста, які гатовы катаваць і страляць людзей.

У гэтай суматосе я зьвярталася да амапаўцаў, абураная іхным зьверствам, ізноў жа да Ярмошына, які ў Гарсавеце заўсёды быў са мной ветлівым, але тут — нават галаву адвярнуў, быццам ня бачыў. Да мяне ж нечакана падышоў начальнік Гарадзкога ўпраўленьня ўнутраных справаў спадар Тарлецкі і сказаў ветліва і неяк па-чалавечы зацікаўлена: "Галіна Фёдараўна, вам тут быць непатрэбна, сыходзьце, прашу вас".

Людзей жорстка штурхалі, імкнуліся разагнаць. Дзе мой муж, я ня ведала. Усе ішлі да плошчы Незалежнасьці, але ўжо не арганізаванай калёнай, а групамі. На перакрыжаваньні праспэкта Скарыны і вул.Камсамольскай раптам спыняецца аўтобус, зь яго выбягаюць спэцназаўцы і на бягу пачынаюць біць людзей гумовымі кіямі. Гэта было абсалютна нечакана і неабгрунтавана (людзі ішлі мірна і спакойна).

Мы з Галяй убачылі, як насустрач бяжыць спэцназавец з шалёнымі вачыма і на бягу лупіць людзей дубінкай направа і налева. Мы адскочылі ў сквер і ўбачылі зьбітага прафэсара Савіцкага. Яго ўжо трымалі людзі і спрабавалі дапамагчы. Вакол беглі людзі, за імі амапаўцы з дубінкамі. Мы з Галяй схаваліся на нейкі час у гарадзкім туалеце.

Наўкол было нейкае вар'яцтва. Налёт, які пачаўся так нечакана, гэтаксама раптоўна скончыўся. Вакол панавала суматоха. Гэтую новую тыпова акупацыйную мэтоду нематываванага нападу на людзей і зьбіцьця ўсіх увёў лукашэнкаўскі Міністар унутранных справаў Захаранка. Памятаю яго грубы выступ па-руску на тэлебачаньні напярэдадні Дня Вайсковай славы, калі ён пагражаў усім расправай. Гэта пры ім амапаўцы пачалі зьбіваць людзей на вуліцах за Бел-Чырвона-Белы сьцяг яшчэ тады, калі ён быў дзяржаўным (1995 г.). (Пазьней Лукашэнка свайго міністра звольніў, і той стаў гаварыць супраць Лукашэнкі, пасьля чаго бяссьледна зьнік. Лічыцца, што ён не жыве. Вінавайцам у зьнікненьні і магчымай сьмерці міністра падазраюць Лукашэнку.) Вось тады на вуліцы я назірала практычнае ўвасабленьне новай рэжымнай палітыкі, якую потым ўдасканаляць наступныя пераемнікі першага лукашэнкаўскага міністра.

Вечарам мы з мужам былі ў Доме мастацтваў на адкрыцьці выставы мастацкай суполкі "Пагоня" ў сувязі са сьвятам 25 Сакавіка, а потым пайшлі ў Дом дружбы народаў на імпрэзу Беларускага Пэн-цэнтру. Журналісты з БТ зьвярнуліся па інтэрв'ю адначасна і да Васіля Быкава, і да Зянона Пазьняка, якія на той момант знаходзіліся на адлегласьці некалькіх мэтраў адзін ад другога. Васіль Уладзімеравіч даваць інтэрв'ю ніяк не хацеў, яго ўгаворвалі, і тады ён сказаў, што пагодзіцца толькі пры ўмове, калі ім не адмовіць Зянон Пазьняк. Пасьля адбыўшыхся падзеяў ён ня верыў, што запіс на БТ калі-небудзь зьявіцца ў эфіры.

Трэба сказаць, што калі праз месяц З.Пазьняк быў за мяжой (якая потым абярнулася эміграцыяй), а я яшчэ знаходзілася ў Менску, я нечакана і неспадзявана ўбачыла гэтае інтэрв'ю Быкава і Пазьняка па БТ, чым была вельмі ўзрушана — знайшліся сьмелыя людзі і прапусьцілі яго ў эфір.

Пасьля імпрэзы Пэн-цэнтру мы з мужам зьбіраліся паехаць на "Паўднёвы Захад" да Галі Дзягілевай, у якой сабраліся сябры Койданаўскай рады з нагоды 25 Сакавіка. Па дарозе сябра мужа, які вёў аўтамабіль, заўважыў, што за намі ідзе сачэньне. Рознымі прыёмамі кіроўцы ён некалькі разоў "правяраў" свае падазрэньні. Сачэньне ад нас не адстала нідзе. На адным з перакрыжаваньняў (на якім машын на той момант не было) мы зьвярнулі ў бок, парушаючы правілы, — "назіральнікі" за намі. Тады мы заехалі ў незнаёмы двор і разьвярнулі машыну. "Сачэньне" ледзь ні наехала на нас. Муж імгненна выйшаў з машыны, падышоў да разгубленых гэбістаў і нешта ім рэзка сказаў. Потым запісаў іхныя аўтамабільныя нумары, і мы паехалі назад, у пракуратуру. На вуліцы Уманскага зноў заўважылі сачэньне, але ўжо з іншай машыны.

У Генпракуратуры муж напісаў заяву на дзеяньні сачэньня (з указаньнем аўтамабільных нумароў) і перадаў дзяжурнаму пракурору. Да сяброў мы прыехалі са спазьненьнем на дзьве гадзіны.

СТРАХ

Назаўтра, 25 сакавіка 1996 г., раніцай я разьвіталася з мужам да вечара і пайшла на працу. Вечарам (як я зразумела, па накіраваньні Зянона) прыехаў на машыне наш нязьменны фронтаўскі кіроўца Юзік Такушэвіч і прывёз ліст ад мужа, дзе ён пісаў, што дадому ня прыйдзе, бо рэжым наладзіў за ім паляваньне. Прасіў, каб я не хвалявалася, супакойваў. Але які тут спакой...

Я сьпешна сабрала неабходныя рэчы мужа, і мы паехалі да Ганны Яўхімаўны, маці Зянона, адвезьці ліст для яе. Па дарозе мы заўважылі сачэньне. Машына-сачэньне чакала нас, пакуль мы былі ў Ганны Яўхімаўны. Цяпер нам трэба было адвезьці рэчы мужу. Мы езьдзілі па вуліцах Заводзкага раёну, спрабавалі адарвацца ад "хваста", але той быў вельмі спрытны. Сітуацыя нагадвала фільм-дэтэктыў, толькі гэта было рэальнае жыцьцё.

Мы зь Юзікам разумелі, што ад нашых дзеяньняў залежыць свабода Зянона Пазьняка, майго мужа. Але адарвацца ад сачэньня ніяк не маглі. Нарэшце, паезьдзіўшы па нейкіх дварах, мы трапілі ў незнаёмы мне тупік. Сачэньня не было відаць, але ўжо было цёмна. Зьлева быў нейкі сад, перад намі быў пустыр, велізарны мокры ад дажджу роў (відаць, пракладвалі трубы), справа нейкая мёртвая будыніна, на якой вісела лямпачка і ад ветру гойдалася і скрыпела. Неба ў хмарах, цёмна — і жудасная цішыня.

— Ты пасядзі, пачакай, я аднясу рэчы. Разам мы ня пройдзем. Я хутка, — сказаў Юзік і імгненна растварыўся ў цемры.

Ніколі ў жыцьці мне не было так страшна застацца адной. Там, ноччу, каля невядомага сада і пустыра, перад велізарным ровам, мне хацелася крычаць ад жудасьці і страху, і я толькі мацней уціскалася ў крэсла аўтамабіля.

Раптам ззаду на хуткасьці пад'ехала машына і, асьвяціўшы мяне ў абсалютнай цемры фарамі, рэзка затармазіла. Сьвятло фараў пагасла.

Я ўрасла ў крэсла і (каб ззаду не было відаць маёй галавы) ціха спаўзла ўніз. Неверагодныя карціны жаху мільгалі ў галаве, і самая жудасная — я ляжу на дне рова, дзе ніхто мяне ня знойдзе. А перад вачыма быў жудасны роў...

Ня ведаю, ці хутка прыйшоў Юзік, мне падалося, што прайшла вечнасьць. Калі ён адчыніў дзьверы аўтамабіля, я была амаль беспрытомная ад страху. Як мы выехалі, дзе дзелася машына, што стаяла ззаду, як мы даехалі да дому — ня памятаю. Калі Юзік адчыніў дзьверы аўтамабіля, я не магла ўстаць з крэсла. Ён неяк выдраў мяне з машыны, але я не магла выпрастацца. Так, сагнуўшыся, я і дацягнулася да кватэры. Юзік паехаў, а я так і засталася сядзець у крэсле да раніцы.

Затым пачаліся доўгія дні чаканьня. Дзе мой муж, я ня ведала, ведала толькі, што ён у сяброў, што ўсё ў парадку.

Праз нейкі час Зянон патэлефанаваў мне з Кіева, потым з Варшавы, Прагі. Сустрэліся мы толькі праз некалькі месяцаў.

Напярэдадні гадавіны Чарнобыльскай катастрофы ў маёй сяброўкі Вольгі Кузьміч памёр бацька, і 25 красавіка мы паехалі яго хаваць на Віцебшчыну. 26 красавіка па Радыё Свабода я пачула, што Зянон у Менску. Я зразумела, што гэта ненадоўга і я ўжо не пасьпею даехаць, каб пабачыцца. Ад вялікага болю я ня тое што плакала, я выла, як вые воўк ці сабака, — так выходзіў зь мяне боль раставаньня і невядомасьці.

* * *

Калі Зянон Пазьняк апынуўся ў эміграцыі, а я яшчэ заставалася ў Менску, мае сябры сачылі, каб са мной і дачкой чаго ня сталася. І вось аднойчы амаль а 12-й гадзіне ночы ў дзьверы маёй кватэры пазванілі.

— Хто там? — зьдзіўлена спытала я.

— Адкрывайце, міліцыя.

— Так позна? Зь якой нагоды? — пытаюся.

— У нас сведенія, что вы скрываете чеченцев, открывайте.

— Што за глупства, нікога я не хаваю і адчыняць вам не зьбіраюся.

— Открывайте, а то хуже будет, — пачула я пагрозу за дзьвярыма.

Гэта былі ня жарты, асабліва, калі пачалі грукатаць ботамі ў дзьверы, а я ў хаце ўдваіх з дачкой. І ноч — хоць вока выкалі.

Я пасьпела патэлефанаваць сябру Сяргею Антончыку, і, як мне падалося, праз хвілінаў дзесяць Сяргей, Валік Голубеў і яшчэ некалькі сяброў Койданаўскай Рады ўжо былі ў нашай кватэры. Потым пад'ехалі Галя Навумчык і Аляксандар Лукашук.

Усе яны прыехалі абараніць нас з дачкой неяк імгненна, быццам у іх былі крылы. І я супакоілася, бо са мной былі мае сябры. Для мяне гэты сяброўскі клапат, як кажуць, быў дарагога варты.

ГАЛАДОЎКА СІЎЧЫКА—ХАДЫКІ

Вячаслава Сіўчыка (сярод іншых) схапілі пасьля Чарнобыльскага Шляху-96. Схапілі, моцна закруцілі рукі, зьбілі. Ю.Хадыка ж быў "на волі". Зянон Пазьняк папярэдзіў яго пра небясьпеку арышту і аб небясьпецы начаваць дома. Тым ня менш, Ю.Хадыка пайшоў дахаты, дзе яго раніцай спакойна (без зьбіцьця) і "ўзялі", калі ён выходзіў з дому.

У знак пратэсту супраць незаконнага арышту В.Сіўчык і Ю.Хадыка абвесьцілі галадоўку. Але галадоўка для іх мела і рознае значэньне, і розныя вынікі.

Прайшло 3—4 дні галадоўкі, і на паседжаньні Управы жонка спадара Хадыкі з абурэньнем расказала мне, што яе "бясхітрасны" муж сказаў сьледчаму ў пастарунку, што для яго галодоўка ня страшная, што ён, наадварот, папраўіць здароўе, ачысьціць арганізм ад шлакаў і што ён робіць гэта пэрыядычна (потым ён выказаў гэта ў адным інтэрв'ю газэце пасьля выхаду з-пад арышту). Хадычыха абуралася, навошта муж расказаў пра гэта (маўляў, гэта непрадбачліва). "Як галадаць — ён ведае, прасіў прынесьці клізму", — дадала яна. (Пра "клізму" я таксама чытала і ў інтэрв'ю самога спадара Хадыкі, здаецца ў газэце "Имя", пасьля таго, як ён ужо быў дома). У камэры спадара Хадыкі былі газэты і нават тэлевізар, аб чым сьведчыў здымак у газэце.

Зусім па-іншаму выглядала галадоўка для Вячаслава Сіўчыка. Ён галадаў зацята, ня ведаючы мэдыцынскіх умоваў галадоўкі, ня піў ваду, не рабіў клізмаў (проста галадаў). Праз нейкі час пачалося самаатручваньне яго арганізма, і паўстала небясьпека жыцьцю. У дадатак В.Сіўчык аб'явіў "сухую" галадоўку (якая доўжылася 16—17 дзён!). Ён рэальна мог загінуць. Рэжым жа да галадуючых ставіўся абсалютна абыякава (маўляў, памруць дык памруць, самі вінаватыя).

З просьбай прыпыніць галадоўку да галадуючых зьвярнуліся Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык, якія на той час былі за мяжой. Але В.Сіўчык, як кажуць, "упёрся рогам" і заступаць рэжыму не зьбіраўся. Ён проста паміраў.

Усе дні галадоўкі ішла сур'ёзная барацьба за жыцьці нашых сяброў. Актыўна змагаліся за жыцьці галадуючых Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык у замежжы. Імі былі напісаны звароты ў розныя міжнародныя арганізацыі, пасланыя лісты, дзе абмалёўвалася сітуацыя і просьба дапамагчы беларускім вязьням. Выступы на радыё, тэлебачаньні, у друку — усё для прыцягненьня ўвагі міжнароднай супольнасьці. Нарэшце, па ініцыятыве Сяргея Навумчыка, ім удалося праз С.Кавалёва і Г.Яўлінскага выйсьці на Ельцына, і гэта вырашыла справу. Хадыку і Сіўчыка выпусьцілі з-пад арышту.

Без усіх гэтых захадаў баюся, што канец гісторыі рэальна мог стацца трагічным для Сіўчыка, нягледзячы на тое, што Фронт на Беларусі таксама шмат рабіў для ўратаваньня галадуючых.

Фронт выстаўляў пікеты пратэсту, былі накіраваныя звароты да дэпутатаў, зьбіраліся тысячы подпісаў грамадзянаў з патрабаваньнем вызваліць галадаючых. Сваякі спадара Хадыкі (жонка, сёстры) усюды хадзілі-езьдзілі з плякатамі, напісанымі друкаванымі літарамі на адзежы, з патрабаваньнем вызваліць прафэсара Ю.Хадыку (і не здымалі іх, аж пакуль іх брат-муж ня быў вызвалены), яны станавіліся ня толькі ў фронтаўскія пікеты, але рабілі яшчэ і свае, асабістыя і г.д. Але на ўсе шматлікія пратэсты рэжым не зважаў.

У В.Сіўчыка якраз нядаўна нарадзіўся сын (яму было ўсяго некалькі месяцаў). Трэба было імгненна прымаць меры для выратаваньня гэтай сям'і. Таму на Управе БНФ я прапанавала зьбіраць сродкі для рэпрэсаваных (якіх было шмат) і на падтрымку іхных сем'яў. "Асабліва шкада маленькага 6-месячнага сына Сіўчыка і жонку Ганну, якая ня мае сродкаў да існаваньня", — зьвярнулася я да калегаў і прапанавала кандыдатуру Алеся Бяляцкага, які б узначаліў гэтую дапамаговую акцыю.

А.Бяляцкі катэгарычна адмовіўся і прапанаваў, каб я і "ўзначаліла" гэтую працу. Адмаўляцца яшчэ і мне ў такой сітуацыі не выпадала, Управа прагаласавала — і я ўзялася. Але з чаго пачаць? Я вырашыла — з дэпутатаў.

Назаўтра ж я выступіла на сэсіі Гарсавета (ў "розным") са зваротам: "Я зьвяртаюся зараз да вас, спадары дэпутаты, не як да прадстаўнікоў пэўных партыяў ці плыняў. Я зьвяртаюся да вашага сэрца. Нягледзячы на вашую прыналежнасьць да любога іншага (ня згоднага з маім) палітычнага накірунку, прашу вас дапамагчы маленькаму 6-месячнаму чалавеку выжыць у сітуацыі, калі ягоны бацька, сябра Беларускага Народнага Фронту, ахвяруе ўласным жыцьцём за ідэю незалежнасьці нашай Беларусі".

У перапынку да стала, дзе я сядзела, падыходзілі дэпутаты і ахвяравалі ўласныя грошы. Сярод іх былі і камуністы, якія былі супраць Народнага Фронту і ідэі незалежнасьці.

Я адразу ж аддала ўсё сабранае Ганьне. Памятаю, да мяне ва Управе падышла жанчына і сказала, што яе сын-прадпрымальнік ня можа асабіста перадаць грошы Ганьне Сіўчык, але прасіў перадаць ёй грошы праз мяне. І яна працягнула мне 100 даляраў ЗША. Я падзякавала і таксама аддала іх Ганьне.

На падтрымку ўсіх затрыманых і іх сем'яў грошы ў Фронце зьбіраліся актыўна. Ужо была ўтворана Камісія па зборы сродкаў у падтрымку рэпрэсаваным зь некалькіх чалавек. На ўсе ахвяраваньні складаліся справаздачы (колькі грошай і хто здаў, каму былі разьмеркаваныя). Найчасьцей я старалася выдатковаць Ганьне Сіўчык, памятаю, Алесь Бяляцкі мяне нават стрымліваў: "Дастаткова, ты ўжо занадта шмат ёй выдзяляеш". Потым, калі я паехала ў эміграцыю, ён узначаліў гэтую камісію, і яна ўвайшла ў "Вясну-96".

Выпусьцілі галадаючых Сіўчыка і Хадыку толькі на 17-я суткі. Калі мы прыехалі з кветкамі, каб у належны час забраць нашых герояў (менавіта так мы ўспрымалі іхную галадоўку), у пастарунку іх ужо не было: нас проста падманулі і паведамілі іншую гадзіну. Мы адразу патэлефанавалі спадару Хадыку дадому і даведаліся, што дома ў яго было поўна радні, што ўсе яны радыя вызваленьню, ніякіх вострых праблемаў няма, усё ў парадку, што назаўтра спадар Хадыка абавязкова ляжа ў шпіталь на рэабілітацыю. Нас запэўнілі, што ўсё будзе добра, каб мы не хваляваліся і ад прапанаванай дапамогі ветліва адмовіліся.

Мы паехалі да Вячаслава Сіўчыка. Калі я ўбачыла Славу, ляжачым на ложку, худога да немагчымага, які зусім ня мог ні рухацца, ні гаварыць, а толькі слаба ўсьміхаўся, сэрца маё сьціснулася. Выглядаў ён вельмі дрэнна, ня мог ня толькі стаяць, але нават сядзець. Хворы і зьнясілены, ён ляжаў на ложку, і ўсе мы вельмі непакоіліся за ягонае жыцьцё.

І жонка Славы Ганна, і ягоная маці, і ўсе мы разумелі, што Славу неабходна тэрмінова везьці ў шпіталь на рэабілітацыю. Але на просьбы сваіх родных зрабіць гэта ён наадрэз адмовіўся, сказаўшы, што ў "казённым доме" ён ужо наляжаўся дастаткова.

Зь вялікім спачуваньнем я глядзела ў трывожныя вочы жонкі і маці Славы, якія прасілі дапамагчы ўгаварыць яго паехаць у шпіталь (бо іхныя ўгаворы не прывялі ні да чаго). І пачалася гаворка. Я паведаміла, што зь лекарамі ўсё ўжо дамоўлена. (Гэта была праўда, бо мы з Юзікам Такушэвічам заранёў зьезьдзілі ў 3-ці клінічны шпіталь.

Я гаварыла зь лекарамі як дэпутат, заручылася іхнай падтрымкай і згодай прыняць нашага героя неадкладна. Увогуле, мы зь Юзікам пераканаліся, што лекары прыхільныя да Фронту і ўсё будзе, як належыць.) "Калі табе ў шпіталі што-небудзь не спадабаецца, мы адразу забярэм цябе дадому па першым тваім патрабаваньні, абяцаю", — заверыла я Славу, каб ён быў спакойны і не хваляваўся. Так агульнымі намаганьнямі нам неяк удалося ўгаварыць яго легчы ў шпіталь, і мы зрабілі гэта неадкладна. У шпіталі ўсё атрымалася так, як мы і спадзяваліся. Лекары аднесьліся да свайго новага пацыента вельмі ўважліва і са спачуваньнем.

Здаецца, назаўтра мы наведалі спадара Хадыку ў 2-м Савецкім шпіталі. Ён выглядаў зусім інакш: сам выйшаў да нас на калідор. Твар ягоны быў схуднелы, але гаварыў ён бадзёра і ўпэўнена, весела і аптымістычна ўсьміхаўся.

У тыя дні ў падтрымку вязьняў Ларыса Урбан прывезла грошы і ад Рады БНР. Гэта дапамога была мэтанакіраваная, ішла не праз фронтаўскую Камісію, і я ня ўмешвалася. Ларыса проста паведаміла мне пра гэта і што перадаў ёй гэтыя грошы (па 200 даляраў кожнаму) Сяржук Сокалаў-Воюш для пяці чалавек. Ларыса папрасіла мяне разам зь ёй зьезьдзіць у шпіталь да Сіўчыка і Хадыкі (дзе яны знаходзіліся на той час), каб аддаць матэрыяльную падтрымку ад Рады БНР. Першым у двары шпіталя мы ўбачылі В.Сіўчыка, які паўляжаў на лавачцы (побач сядзела Ганна), ён быў, як і раней, худы і зьнясілены і, здавалася, зусім ня меў сілы. Ларыса перадала яму капэрту з грашыма, але Слава нават не глянуў на яе і сказаў, каб аддалі жонцы.

Потым бачыліся з Хадыкам, і Ларыса перадала яму дапамогу, кораткa пагаварылі пра самаадчуваньне. Ён казаў што ў цэлым адчувае сябе нядрэнна.

Пасьля курса рэабілітацыі спадар Хадыка паехаў на аздараўленьне ў Ізраіль — нейкім цудам яму ўдалося дамагчыся візы і выехаць. На тыя часы атрымаць замежны пашпарт і візу, каб выехаць за мяжу, было вельмі складана. АВІРы адмыслова працавалі марудна, і чэргі там былі "на гады". Але і рэжым тады яшчэ ня быў такім усемагутным, як цяпер, людзі яшчэ знаходзілі магчымасьці нешта рабіць.

Слава Сіўчык цяжка і доўга аднаўляў свае сілы ў Менску. Памятаю, у яго былі сурёзныя праблемы са здароўем, нейкі час была небясьпека страты працаздольнасьці рукі, якую моцна перабілі ці "закруцілі" гарылы рэжыму, і яна, як казалі, "усыхала".

СУСТРЭЧА-ВЫРАТАВАНЬНЕ

З мужам убачыліся мы толькі ў канцы траўня ў Варшаве. Я ехала да яго, як на крылах ляцела. Муж сустрэў мяне з кветкамі. Я плакала ад перажытага і ад шчасьця. Але той страшны выпадак, той страх не прайшоў для мяне бяссьледна. Я ўздрыгвала ад самага слабага скрыпу дзьвярэй, ад усялякага гуку, плакала без прычыны. Муж усё зразумеў. Цэлы месяц мы былі разам. Ён ня проста мяне аберагаў, ён ахінуў мяне сваёй цеплынёй і трымаў датуль, пакуль я ўнутрана не супакоілася. Мы гулялі па Варшаве, муж быў надзвычай уважлівым. Ён прадугледжваў любую дробязь, каб я не захвалявалася, каб мне было ўтульна і камфортна. Калі аднаго разу ён выходзіў на балкон, то ад скразьняку стукнулі дзьверы. Муж імгненна ўскочыў у пакой да мяне, каб пераканацца, ці не спужалася я. Ён перажываў за мяне так, як быццам я была шкляная і магла "разьбіцца" ад самага маленькага ветру.

Тады, у 1996 годзе, Зянон часта выступаў у заходнім друку (розныя інтэрв'ю), па тэлебачаньні. Таму дзе б мы ні йшлі, яго ўвесь час пазнавалі палякі, ціснулі яму руку, выказвалі сваю салідарнасьць і падтрымку. І гэта было амаль на кожным кроку.

Месяц праляцеў, і я ад'ехала ў Менск, дзе мяне чакала дачка і мама. Праз нейкі час я прыехала зноў. І вось у пачатку ліпеня Зянон Пазьняк і Сяргей Навумчык ад'ехалі з Варшавы ў Лёндан і потым у ЗША па запрашэньні амэрыканскай ўрадавай арганізацыі. Мы дамовіліся, што, як яны вернуцца ў Варшаву, я прыеду да іх ізноў.

ЭМІГРАЦЫЯ. ВАРШАВА

25 ліпеня 1996 г. Зянон патэлефанаваў мне зь Нью-Ёрку і сказаў, каб мы з дачкой тэрмінова прыехалі ў Варшаву. Мы дамовіліся, што праз два дні мы прыедзем (так прасіў і настойваў муж), а ён прыляціць і сустрэне нас у Варшаве. Размова падалася мне нейкай дзіўнай, але я ня стала задаваць ніякіх пытаньняў, бо разумела, што нашу размову слухае КДБ. Ад радасьці, што мы спаткаемся, я не раздумваючы стала зьбірацца.

Назаўтра патэлефанавала Галя Навумчык. Мы сустрэліся ў скверы каля Купалаўскага тэатра. І тут яна мне сказала, што таксама размаўляла з Зянонам, што размова была "эзопава", але напэўна мы ад'едзем у эміграцыю. Я толькі спытала: "Як ты думаеш, на які час?"

— Думаю, на год, а мо і на 5, — сказала Галя.

Трэба сказаць, я гэта ўспрыняла спакойна. Слова "эміграцыя" тады для мяне ня значыла нічога, я адчула ў ім нейкую рамантыку, магчымасьць пабачыць сьвет (а езьдзіць я любіла). Паняцьці "рамантыка", "вандроўка" наклаліся на паняцьце "эміграцыя", засланіўшы на той час зьмест гэтага жахлівага страшнага слова, і я як бы забылася пра сэнс нашага ад'езду. З дачкой Надзеяй мы дамовіліся, што ў жніўні вернемся. Я сама ў гэта шчыра верыла.

Мы хутка сабраліся, узялі толькі летняе адзеньне. Перад ад'ездам я накансэрвавала шмат кампотаў зь ягад, наварыла чарнічнага варэньня і папрасіла маму разьліць па банках, калі яно астыне (вядома ж, зімой як знойдзем).

28 ліпеня 1996 года мы з дачкой прыехалі ў Варшаву, але сустрэў нас знаёмы мужа, адвёз на кватэру, даў ключы і зьехаў. Мы з дачкой апынуліся адны ў чужой кватэры, у чужым горадзе, у чужой краіне. Патэлефанаваў муж і сказаў, што пляны зьмяніліся і хутка мы паедзем у Нью-Ёрк.

Тым часам стала вядома, што Лукашэнка прызначыў у беларускай амбасадзе ў Варшаве спэцыяльную "адзінку" для выяўленьня і "вяртаньня" "ворагаў народа" — грамадзянаў Беларусі за мяжой. Да таго часу рэжым ўжо назваў Пазьняка і Навумчыка "ворагамі народа" (хоць пасьля адкрыцьця страшнай праўды пра Курапаты здавалася, што гэтая тэрміналёгія ня вернецца ніколі). Таму для мяне было зразумела, чым зьбіраліся займацца спэцслужбы рэжыму Лукашэнкі ў Варшаве і пад каго канкрэтна была ўведзена тая "адзінка". Вяртацца ў Варшаву Зянону Пазьняку і Сяргею Навумчыку стала небясьпечна. У гэты ж час ім стала вядома пра рашэньне лукашэнкаўскіх спэцслужбаў аб "нэйтралізацыі" (г.зн. забойстве) Зянона Пазьняка на тэрыторыі Польшчы і (пад пытаньнем) Сяргея Навумчыка. Неўзабаве яны папрасілі палітычны азыль у ЗША і атрымалі яго вельмі хутка, за два тыдні (звычайная працэдура цягнецца значна даўжэй). Муж патэлефанаваў і сказаў, што цяпер мы хутка прыедзем у ЗША, бо па законах гэтай краіны ўзьяднаньне сям'і павінна адбывацца на працягу 2—4 тыдняў.

Мы з дачкой чакалі, што хутка паедзем у Амэрыку, але што за гэтым стаіць (што трэба будзе застацца там) — мы пра гэта ня думалі. Паедзем — потым вернемся (уяўлялася так). Ні вопыту, ні ведаў пра эміграцыю у нас не было. Прайшоў жнівень, а дазволу на ўезд у ЗША не было. Мы пайшлі высьветліць гэтае пытаньне ў амэрыканскую амбасаду. Там нам паведамілі, што пра нас з дачкой ведаюць, нашыя прозьвішчы ў кампутары, але з Амэрыкі не прыйшоў яшчэ нейкі жоўты блянк, і, верагодна, нам прыйдзецца пачакаць месяцы тры.

Я не паверыла сваім вушам. Тры месяцы?! Яны, відаць, жартуюць. Такога ня можа быць, гэта вытрымаць немагчыма — роіліся думкі.

Але прайшлі тры месяцы, чатыры, пяць — папераў не было. І паступова пачала падступаць настальгія. Хто яе не перажыў, таму цяжка патлумачыць значэньне гэтага слова, бо гэта ня проста "знаходжаньне ўдалечыні ад Беларусі" — гэта немагчымасьць вярнуцца. Неверагодная туга не адпускае ні ўдзень, ні ўначы. Баліць душа. І гэта нельга нават параўнаць з баленьнем цела (хоць боль фізічны вельмі пакутлівы).

Мы жылі паміж Амэрыкай, Польшчай і Беларуссю. Мужу не выдавалі выязных дакумантаў, нас не пускалі туды. У Амэрыцы муж, у Беларусі мама, дом, Радзіма. Мы з дачкой — у Варшаве, дзе адчувалі сябе адзінока і няўтульна. Кожны дзень размаўлялі па тэлефоне з Нью-Ёркам, Менскам — і не маглі нагаварыцца. Тут, у чужой краіне, усё было нямілa. (Краіна, канешне, тут ні пры чым. Гэтаксама горка нам бы было ў любой іншай краіне Эўропы.) Мы адчувалі сябе абсалютна адны, як у вакууме.

Асабліва цяжка было вечарам, калі адзінота і жах падпаўзалі блізка, проста ў пакой. Боязна было выключыць сьвятло, і мы з дачкой уключалі тэлевізар, які не разумелі. Але ён нешта гаварыў, і было ня так жудасна.

А яшчэ мяне мучылі мацярынскія думкі-пачуцьці. Пачаўся навучальны год, дачка павінна была пачаць вучобу на другім курсе юрыдычнага аддзяленьня Гандлёвага тэхнікуму, а яна заставалася ў Варшаве і замест вучобы сядзела са мной у чужой краіне. Дачушка таксама вельмі мучылася, бо ў 18 год апынуцца фактычна ў затачэньні і без усялякага веданьня "пэрспэктывы" нашага цярпеньня, без сяброў у гэтым узросьце, сапраўды, нялёгка. І разумеючы, што гэтыя яе мукі праз мяне, я не знаходзіла сабе месца. Надзя рвалася ў Менск, я жудасна баялася за яе, ведаючы зьвярыныя павадкі рэжыму, і ніяк адпусьціць яе не магла. Але дачцэ было так кепска і дрэнна, яна мучылася неверагодна і ўвесь час прасіла адпусьціць яе з гэтай "турмы без прысуду". Ступень небясьпекі ад рэжыму для сябе яна не ўсьведамляла.

Гэтымі ўсімі мукамі я была даведзеная да мяжы. І тады я сказала дачцэ, што адпускаю яе, але гэтую разлуку і яе вяртаньне ў абцугі рэжыму перажыць ня ў стане, бо ведаю, што адпускаю яе на пагібель.

Маё гора было настолькі сапраўдным, што, перамагаючы сваё цярпеньне, дачка вырашыла застацца з маці, якая проста паміра-ла ад гора. І мы разам і плакалі, і суцяшалі адна адну.

Ішлі дні, падобныя адзін на другі. Туга падступала шчыльней. Мне было вельмі цяжка, але, думаю, яшчэ цяжэй было дачушцы Надзеі, якая была адарваная ад сяброў-аднагодкаў і ўсе дні падрад сядзела ў хаце са мной (у чужым горадзе нікуды ісьці не хацелася, ды мы і ня ведалі тут нічога).

Аднаго разу, едучы ў трамваі, я задумалася і заехала далёка. Так выпадкова я апынулася ў варшаўскім парку, што ў раёне "Прагі". Я ішла па ім і казала сабе: "Глядзі, тут такая самая трава, канюшына, кветкі, рэчка цячэ, як у нас, на Беларусі, дрэвы... Ну ўсё-ўсё амаль такое самае, як у нас!"

Але і сярод гэтага цудоўнага куткa прыроды не магла забыцца і ўявіць, што я дома. Усё навокал было прыгожае — і чужое.

"Чаго ж табе трэба? — пыталася я сама ў сябе. — Ты любіш прыроду, лес, рэчкі, лугі — вось яны, перад табой. І яны такія ж, як на Беларусі. Дык што? Што ж так цягне душу?" А душа ў такія моманты адчуваецца проста фізічна, бо яна баліць і цягне на Усход. І гэта вельмі цяжкая мука.

Каб неяк ратавацца, мы з дачкой спрабавалі розныя спосабы. Спрабавалі чытаць — не чыталася. Я спрабавала шыць сукенкі-касьцюмы ўручную (машыны не было). Пашыла некалькі рэчаў — але ўсё гэта ня радвала. Хадзілі ў крамы, разглядалі розныя тавары, куплялі нешта смачнае. Але ўсё гэта не дапамагала — хоць золата насып у талерку. Нічога было ня міла і нічога ня трэба, акрамя Беларусі. Дадому — хоць на ваду і хлеб, хоць апранутай у дзяругу, хоць у турму. А дадому было нельга...

Калі душа цягне на Радзіму, Бацькаўшчыну не заменяць і залатыя горы. Гэтую ісьціну мы моцна выпакутавалі.

(Працяг будзе.)

Менск, 26 красавіка 1996 г. Нечаканае вяртаньне З.Пазьняка з-за мяжы на "Чарнобыльскі Шлях-96".

Народная Воля http://www.nv-online.info
10 КРАСАВІКА 2008 г.

ПРАБЛЕМА

Пагарэльцаў пачалі караць штрафамі

Пракурор Пінскага раёна Іван Наскевіч падтрымаў выратавальнікаў у патрабаванні спаганяць з пагарэльцаў грашовыя штрафы і кампенсацыі за выезд на пажары.

З аператыўнай зводкі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях:

"За суткі ў населеных пунктах Беларусі адбыліся 22 пажары. Знішчаны 4 пабудовы. Загінулі 7 чалавек".

"За суткі ў населеных пунктах Беларусі адбылося 20 пажараў. Пашкоджаны 13 забудоў. Загінулі 3 чалавекі".

І так кожны дзень...

Увогуле, МНС фіксуе: "Ад пачатку 2008 года ў краіне адбылося больш як 1600 пажараў. У агні загінулі амаль 280 чалавек, у тым ліку 8 дзяцей. Траўміравана больш як 100 чалавек. Агонь знішчыў 278 пабудоў, пашкодзіў — 1730".

— У нашай вёсцы Беражцы двое беспрацоўных суткі навылёт пілі "чарнілы", — расказвае мясцовы жыхар Іван Бут-Гусаім, — разам яны спустошылі 11 пляшак. Пасля адзін паклыпаў дахаты, а другі прылёг на ложку ў сваёй хаце. Закурыў і ўчыніў пажар. Ледзьве сам ногі вынес.

Суразмоўца кажа, што суседзі выклікалі выратавальнікаў. Тыя дамчаліся хутка, бо пажарны пост знаходзіцца ў цэнтры сельгаскааператыва "Парахонскі", а гэта ўсяго ў некалькіх кіламетрах ад вёскі Беражцы.

Пажарнікі залілі агонь і падлічылі, што іх праца каштуе 157 тысяч 420 рублёў. На каго спісаць гэтыя расходы?

— Толькі на самога пагарэльца! — пераконвае інспектар Пінскага атрада МНС Аляксандр Германовіч. — Не такая дзяржава багатая, каб траціць бюджэтныя сродкі на розную п'янь!

У гутарцы са строгім інспектарам даведалася, што Пінскі гарадскі аддзел МНС ужо практыкуе спагнанне грошай з вінаватых пагарэльцаў.

— За юрыдычнай кансультацыяй і парадай мы звярнуліся да новапрызначанага пракурора Пінскага раёна Івана Наскевіча, — паведамляе суразмоўца, — давялі, што практычна ў кожным чацвёртым з пажараў вінаваты самі гаспадары.

Пракурор Іван Наскевіч прааналізаваў сабраныя выратавальнікамі факты. І паводле 12 падпалаў пракуратура вылучыла грашовыя іскі на карысць МНС.

Напрыклад, у вёсцы Пінкавічы гаспадыня зацепліла печку і, не зачыніўшы яе дзверцы, адышла ў краму. А ў гэты час з топкі вываліўся вугольчык. На дым у хаце вяскоўцы выклікалі выратавальнікаў. У барацьбе з пачаткам пажару тыя затрацілі сілаў і сродкаў на 106 тысяч рублёў. Маёмасці выгарала на паўтара мільёна.

У вёсцы Чухава гаспадар сядзібы пакінуў без нагляду ўключаны электракіпяцільнік. Калі вада ў шклянцы выпарылася, электрапрыбор успыхнуў. У гэтым выпадку выратавальнікі налічылі іск пагарэльцу ў суме 338 тысяч 390 рублёў.

У Пінску пачаліся суды. Цяжка бачыць, як трасуцца рукі і коцяцца слёзы ў пагарэльцаў. Некаторыя з іх увогуле ўцякаюць з залы пасяджэнняў, клянуць існуючую ўладу.

...Дымава, Агнёўка, Папялішкі, Пагарэлка, Пекла, Пярунова, Двор-Жары, Ізбужар, Гарэліца, Гарэлы Бор, Пагарэлы Востраў, Новыя Гараны, Угляны... Падлічана, што больш як 800 вёсак у Беларусі маюць назвы, якія так ці інакш паходзяць ад памяці пра пажары. Тут цяпер можна пачуць пра шматлікія прыклады салідарнасці грамады ў дапамозе пагарэльцам. Але не было яшчэ ў гісторыі беларускіх вёсак прыкладаў, каб пагарэльца цягнулі ў суд і адбіралі на штрафы грошы, якія збіраюць для яго аднавяскоўцы.

Галіна БАРАВАЯ.
www.bulletinonline.org

ЧУЛІ?

Гродзенская ялавічына паляцела ў Іран

Перад тым як прадукцыя накіравалася ў Тэгеран, мула Джафар Аль-Хусэйн маліўся на гродзенскім мясакамбінаце, каб бог ачысціў ялавічыну.

Гродзенскі мясакамбінат — пакуль адзінае прадпрыемства ў Беларусі, якое атрымала права экспартаваць сваю прадукцыю ў Іран. Аднак дзеля гэтага гродзенскім мяснікам неабходна выканаць правілы кашэрнасці, якія патрабуюцца ў Іране, піша "Вечерний Гродно".

— *Дзеля гэтага неабходна, каб жывёла мела мінімальны стрэс перад убоем. Напярэдадні быкоў кормяць яблыкамі, а ў цэху гучыць музыка,* — удакладніў Джафар Аль-Хусэйн.

У Гродна музыкі не было, абмежаваліся малітвай. Мула хадзіў па прадпрыемству з компасам, каб тушы падымаліся на канвеер дакладна на ўсход.

Кантралявалі працэс іранскія спецыялісты. Адразу з аэрапорта Тэгерана мяса накіруецца ў крамы ўсходняй краіны.

У красавіку ў продажы з'явіцца беларускі мабільнік

Збіраецца "Еўратэф-М" на мінскім УП "Прамсувязь" з кітайскіх дэталяў.

У тэлефона каляровы экран і ёсць відэакамера. Асаблівасцю "Еўратэф-М" з'яўляецца магчымасць выкарыстання адначасова ў якасці звычайнага бесправаднога і сотавага тэлефона стандарту GSM.

Па папярэдніх падліках, кошт апарата не перавысіць 300 тысяч рублёў.

АСОБА

Уладзімір ПЕЦЮКЕВІЧ:

«У мяне дзве Музы — Беларусь і жонка!»

Нядаўна паэту, сябру Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміру Пецюкевічу споўнілася 65 год. Партрэт актыўнага сябра Мінскага культурна-асветніцкага клуба "Спадчына" (мастак Алесь Цыркуноў) знаходзіцца ў прыватным музеі Анатоля Белага ў Старых Дарогах.

На вершы У.Пецюкевіча створана больш за 200 песень. Выкананне некаторых з іх прыносіла лаўры спевакам. З песняй "Балада" Ірына Дарафеева яшчэ ў 1999 годзе на "Славянскім базары" заняла першае месца, "Рэха жураўлінае" ў выкананні Паліны Смолавай у 2005 годзе было адзначана Гран-пры. За песню "Сінь азёрная" малдаўскай спявачцы Н.Гардзіенка ў 2006-м прысуджана чацвёртае месца. Больш бы такіх прыгожых родных песень гучала на тым жа "базары", на іншых прэстыжных пляцоўках, у эфіры — і мы б убачылі, адчулі: беларусам ёсць чым ганарыцца, і няма чаго забіваць сабе вушы спрэс расійскай папсой не заўжды лепшага гатунку.

Да вершаў У.Пецюкевіча звярталіся кампазітары Д.Даўгалёў, родны брат Уладзіміра — М.Пецюкевіч, М.Алешка, М.Захлеўны, П.Яроменка і іншыя. На тэксты паэта створаны араторыя "Зорка Палын", кантата "Дарога — сцяжына матулі і сына", цыкл дзіцячых песенек, музычная казка "Птушыны кірмаш", песенны альбом беларускага вяселля "За маладых!".

Больш за 500 вершаў паэта сабрана ў выдадзенай ім кнізе "Узняўся белы птах". Яны звонкія і прыгожыя, як вясельны крышталёвы келіх. У іх — гарэзная весялосць і самота, туга па незваротна страчаным і боль ад выпаўшай на долю беларуса бяды. У іх — і гонар за наш край, наш народ. Паўстаюць у гэтых вершах знакамітыя постаці Еўфрасінні Полацкай, Вялікага князя ВКЛ Міндоўга, Канстанціна Астрожскага, Кастуся Каліноўскага, Эміліі Плятэр, Ларысы Геніюш...

Нарадзіўся Уладзімір на Браслаўшчыне. Бацька, Генрых Язэпавіч у 1944 годзе загінуў на Прыбалтыйскім фронце. Уладзімір атрымаў спецыяльнасць, далёкую ад літаратуры — скончыў Інстытут механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі. Аднак прыцягненне паэзіі прывяло яго ў паслястудэнцкія гады ў літаб'яднанне пры Барысаўскай раённай газеце "Камуністычная праца". Кіраваў тады аб'яднаннем паэт Міхась Стрыгалёў. Яны пасябравалі. Гэта дало маладому паэту плён у вершаскладанні, а нацыянальны падмурак, любоў да матчынай мовы ўжо былі закладзены сям'ёй, беларускай школай, дзядзькам Мар'янам. Было яшчэ добрае сяброўства з паэтам-патрыётам С.Новікам-Пеюном, які за сваю беларускасць зведаў турмы польскія і савецкія, а фашыстамі быў пастаўлены пад расстрэл, ды выжыў пасля атрыманых ран...

Пра планы на будучае паэт гаворыць:

— Хачу выдаць дзве кніжкі, але няма фундатараў. Пенсіянеру ж гэта не па кішэні. Цяпер нават даехаць да выдавецтва, тым болей неаднойчы, стала праблемай.

Але не губляе аптымізму, спадзеўкі на лепшае, прызнаецца:

— У мяне дзве цудоўныя Музы — Беларусь і любімая жонка, як некалі ў майго дзядзькі Мар'яна.

А Мар'ян Пецюкевіч, пра якога размова, — вядомы вучоны-этнограф, грамадскі дзеяч, літаратар-публіцыст, які ў першы свой арышт адразу пасля вайны зведаў жорсткія катаванні энкавэдыстаў. Затым, у 1949 годзе, быў прыгавор: "Решением Правительства Литовской ССР... как белорусский националист переводится со своим семейством... в отдаленные места Советского Союза..." — горад Ужур Краснаярскага краю. У 1952 годзе — зноў арышт і прыгавор да 25 гадоў катаргі... Нездарма выдадзеную кнігу "Узняўся белы птах" яго пляменнік Уладзімір прысвяціў "светлай Памяці дзядзькі Мар'яна", да якога атрымаў у спадкаемства бязмерную любоў да Бацькаўшчыны, паэзіі і свайго народа.

Мікола ЛАВІЦКІ.

На здымку: Уладзімір Пецюкевіч з жонкай Аксанай на лецішчы (2002 г.).

Калектыў газеты "Народная воля" віншуе Уладзіміра Генрыхавіча Пецюкевіча з 65-годдзем, зычыць яму добрага здароўя і новых поспехаў на карысць нашага грамадства!

Дзень Волі

Бацяны прынеслі Звеставанне,
Свята добрай весткі ў родны край:
На душы развеснена-світальна,
На стале святочны каравай.

Прыгадаем слынную падзею,
Як ад Бога вестачку прынёс
Габрыэль-анёл Марыі Дзеве,
Што Яе славутым будзе лёс,

Што Яна народзіць Збаўцу свету —
Ён памрэ і ўскрэсне за людзей...
Недарэмна ў гэты Дзень прасветлы
Чуем рэха і другіх падзей.

Дзень свяшчэнны Волі блаславёнай —
Дваццаць пятае Сакавіка.
Разам, брацці, змагароў успомнім,
Што Радзіму ўславілі ў вяках!

Хай жа ім, хто клікаў мары здзейсніць,
Смела ўзняў над Краем вольны Сцяг,
Будзе лёгка ў Вечнасці нябеснай,
Хай жа зорыцца іх слаўны Шлях!

Кружыцца месяц з заранкай

Зорыцца неба, іскрыцца
З вогнішчам яркім напару —
Яснілца гай, весяліцца
З песняй купальскай і марай.

Грае рака-віраванка,
Музыка льецца ў нябёсы —
Кружыцца месяц з заранкай —
О, як таемна-дзівосна!

Быццам цурчанне крыніцы,
Словы імкнуцца да сэрца:
— Зорка мая Мілавіца,
Ты — наймілейшая ў свеце!..

Быццам чароўная казка,
Чуюцца словы прызнання:
— Месяц мой, месячык ясны,
Ты — наймілейшы, каханы!..

Грае рака-віраванка,
Музыка льецца ў нябёсы —
Кружыцца месяц з заранкай...
О, як таемна-дзівосна!

ОТ ПЕРВОГО ЛИЦА

Татьяна Протько эмигрировала в США

Так ли это?

По Минску пополз слух о том, что председатель "Белорусского Хельсинкского комитета" Татьяна Протько эмигрировала в США. Так ли это? Выяснил журналист Александр Томкович.

Александр Томкович: — Спасибо, Татьяна Сергеевна, за согласие ответить мне по электронной почте. Думаю, всем будет интересно узнать причину вашего отъезда? Можно ли его считать политической эмиграцией?

Татьяна Протько: — Нет, конечно, ни о какой эмиграции, тем более политической, речь не идет. У каждого человека, кроме прав, есть еще и обязанности. И не только перед обществом, страной, государством, но и перед семьей, родными и близкими. В советское время нас учили, что главное — это обязанности перед обществом, государством, а семья — нечто второстепенное, незначительное. Вначале я тоже так считала, но жизнь убедила, что это не так. В горе, болезни, старости, в трудные минуты жизни именно родные и близкие помогают человеку. Утешают, ухаживают, поддерживают материально, хоронят, в конце концов. И главное, ты не чувствуешь себя обязанным, потому что знаешь, что тебе как бы возвращают твою заботу и любовь (хотя мои дети утверждают, что будут заботиться о нас независимо от того, что мы для них сделали или не сделали). Сейчас моей старшей дочери трудно — она поступила в аспирантуру, учится на теолога, перестраивает дом. И, кроме того, у нее четверо детей: от 3 до 11 лет. Дочь попросила помощи. И я помогаю. В конце апреля возвращаюсь — надо садить огород и цветы.

А.Т.: — А в чем, кроме *"ты виноват уж тем, что хочется мне кушать"*, суть проблемы БХК? За что хотели судить?

Т.П.: — Проблема с БХК имеет несколько аспектов. Я бы сказала, для внутреннего и внешнего пользования. Организация очень активна и авторитетна на международной арене. Чтобы нанести удар по нашему авторитету, государство предприняло довольно хитрый ход — обвинило в неуплате налогов. Для западного человека это одно из самых серьезных обвинений в нарушении закона. Очень трудно доходчиво объяснять, почему мы правы, а государство нет. Обвинение в неуплате налогов в особо крупных размерах — серьезное обвинение и с точки зрения белорусского законодательства. В результате комитет лишился легального финансирования своей деятельности, надо мной, как руководителем, якобы совершившим преступление, висит угроза постоянного наказания. Лишение свободы до 7 лет с конфискацией имущества. И хотя об этом сегодня предпочитают не вспоминать, правовая коллизия не разрешена, и при необходимости *"посадка"* может быть осуществлена достаточно быстро — *"правовые"* основания для этого созданы, это — решение Президиума Высшего Хозяйственного суда Беларуси.

А.Т.: — Собираетесь ли вы и в дальнейшем возглавлять комитет?

Т.П.: — Нет, я оставляю пост председателя БХК. Написала соответствующее заявление, представила его в Раду. И хотя Рада мою отставку не приняла, формально, согласно Уставу БХК, моего заявления для отставки достаточно.

А.Т.: — Что, на ваш взгляд, сегодня происходит в Беларуси?

Т.П.: — Причиной, которая меня подвигла так кардинально изменить свою жизнь, стал анализ ситуации в Беларуси и осмысление его результатов. Мне

не очень нравится вывод, который я сделала из этого анализа и осмысления, но ничего не поделаешь — правда есть правда.

Я и мое поколение сделали многое для победы демократии в Беларуси, но еще больше не сделано. Мы не смогли разъяснить людям, почему демократия нужна и чем плох, утопичен "советский социализм", убедить их в своей правоте. Мы не смогли найти достаточно активных сторонников для своей деятельности. А главное, мы не достигли победы. Конечно, за эти годы мы приобрели опыт и навыки политической борьбы, знаем ситуацию как внутри страны, так и международную конъюнктуру. И сегодня, например, меня практически невозможно демократическим образом лишить поста председателя БХК. Но для развития организации, для роста ее авторитета нужны новые люди, которые не знают горечи поражений, уверены в победе, полны идей и готовы взять на себя ответственность за будущее страны. Таким людям (их много не только в БХК) надо дать возможность реализовать себя на благо страны. На свое благо. Решила уйти. Это не значит, что я буду только выращивать цветы возле своего дома. Думаю закончить уже начатые книги и написать новые, выступать с лекциями, сотрудничать с демократической прессой.

В Беларуси, мне кажется, Бог ставит эксперимент. Цель его — показать людям всего мира призрачность, несостоятельность, утопичность советской социалистической идеи. Идея эта имеет как бы две составляющие — на уровне государства и на уровне отдельного человека. Осуществляется этот эксперимент действующим президентом и его ближайшим окружением, которые уже более 10 лет стараются реализовать ленинские идеи с "новой экономической политикой" без сталинских искривлений. В Беларуси восстановлены не только институты власти советского периода (правда, с небольшими изменениями, связанными с изменением роли Компартии), системы обучения, идеологической обработки ("идеологического воспитания"), но и идеалы, нормы жизни советских людей, уважение к советскому прошлому. В России, на территории бывшего СССР, предпринята отчаянная попытка приспособить "советское" к изменившемся условиям в мире. В программных работах одного из высших чиновников государства А. Рубинова провозглашается воинствующий материалистический атеизм.

Но стала ли лучше жизнь общества, гармоничней, духовней, или, как раньше говорили, культурней? Нет, пороки и язвы "советского социализма" стали еще более явными и болезненными: возвращается в нашу жизнь контроль со стороны КГБ за политической лояльностью граждан, безраздельная власть силовых ведомств, рост коррупции в государственных структурах. У нас, конечно, массово не расстреливают. Но люди не стали жить свободнее, они опять только винтики, которые можно использовать, как захочет власть. Последний страшный пример этому — события на шоссе, когда машины простых людей выставили в качестве "живого щита". Страх, боязнь будущего, неуверенность в собственных силах и отсюда — зависть, пьянство, проституция — становятся постоянными спутниками жизни человека, особенно в небольших городах. Материально люди сегодня живут, бесспорно, лучше, чем 20 лет назад. Но это не заслуга власти или "белорусской экономической модели", а следствие развития европейской цивилизации, потенциал которой в нашей стране используется далеко не в полную силу. А сегодняшняя стабильность — заслуга тех, кто выторговал у России дешевые энергоносители. И понятно, что успех этот временный. Мы, как древние евреи, уже вышли из Египта, но все еще продолжаем молиться ложным богам.

А.Т.: — Что, по вашему мнению, должны сегодня делать оппоненты власти?

Т.П.: — Мне вообще не нравится словосочетание "оппоненты власти". Наш народ хорошо понимает, что плохая власть всегда лучше, чем ее отсутствие. Поэтому тех, кто выступает против власти вообще, у нас не приветствуют. Мне больше нравится другая постановка вопроса: что делать людям, которые хотят быть счастливыми в этой стране, и что делать тем, кто хочет, чтобы все или как можно больше людей в Беларуси были счастливыми? Ответ на первую часть вопроса предполагает личную активность, на вторую — коллективную. Я не собираюсь излагать стратегию и тактику борьбы за счастье в Беларуси. Это тема не для короткого интервью. Но есть общий момент, который помогает решить проблему счастья — обладание властью и деньгами. Открытия моего здесь нет, истина эта известна очень давно. Но, к сожалению, белорусская демократическая оппозиция начисто проигнорировала эту истину, заклеймив всех, кто так или иначе связан с действующими властными структурами, изолировав себя и от власти, и от денег. Мне представляется актуальным призыв ко всем порядочным и способным людям: идите "во власть"! Вытесняйте оттуда посредственностей, хитрецов и подлецов, которые сегодня незаслуженно используют самый лучший механизм "счастья" — власть — только для себя, только в личных целях. В этом случае мы сможем вернуть авторитет "власти", чтобы люди уважали ее, считали своей защитницей, чтобы работа во властных структурах вызывала не зависть, как сейчас, а общественное признание заслуг перед Богом и людьми.

А.Т: — Но действительно, сколько можно проигрывать? Почему это происходит?

Т.П.: — Когда играешь, проигрывать можно сколько угодно раз, все зависит от мастерства игроков. Но на самом деле игры-то нет. Есть только ее имитация, потому что любая игра предполагает единые правила для всех игроков. Даже "бои без правил". У нас же у демократической оппозиции свои правила, у власти — свои. Когда подводятся итоги, все считают себя если не победителями, то успешно проведшими игру. И поэтому все игроки в той или иной степени довольны. Основная масса белорусов не играет ни в какие игры, но, как ни парадоксально, именно она является проигравшей. И пока это не станет понятным, игры без правил будут продолжаться. В принципе, когда есть хлеб, зрелища и нет войны, "масса" может молчать долго. В реальной жизни все сложнее. Мне кажется, если дальше будет так продолжаться, то очень скоро достаточно будет нового "живого щита" или еще какой-либо другой ошибки со стороны представителей власти, чтобы возмущение людей стало массовым и грозным. Но кто сможет воспользоваться результатом? Большой вопрос. У нынешней демократической оппозиции пока на это шанс минимальный.

"Наше мнение".

НУ І НУ!

Ужо не ведаюць, як выкручвацца

Намесніца старшыні Гарадоцкага райвыканкама Н.Бурунова адмовіла мясцовым актывістам у просьбе правесці пікет у абарону звольненага за палітычную дзейнасць старшыні Гарадоцкай суполкі Партыі БНФ, актывіста незарэгістраванага Руху "За Свабоду" Леаніда Аўтухова. І не было б дзіва ў гэтай навіне (на жаль, падобныя факты сталі звычайнымі), каб не "кантэкст" забароны.

У адказе чыноўніцы гаворыцца, што Законам "Аб масавых мерапрыемствах у Рэспубліцы Беларусь" такі від масавага мерапрыемства, як пікет, не прадугледжаны. Гэтым законам прадугледжаны наступныя віды мерапрыемстваў: сход, мітынг, вулічнае шэсце, дэманстрацыя, пікетаванне і іншыя масавыя мерапрыемствы культурнага, спартыўнага значэння".

А чым пікет адрозніваецца ад пікетавання, хто адкажа?

Дэмакратычныя актывісты Гарадка рыхтуюць паўторны зварот да мясцовай адміністрацыі з просьбай правесці 23--24 красавіка менавіта "пікетаванне". Падчас мерапрыемства актывісты плануюць распаўсюджваць інфармацыю пра звальненне Леаніда Аўтухова, патрабаваць яго аднаўлення на працы і выступаць супраць кантрактнай сістэмы як сродку барацьбы з іншадумствам, паведамляе сайт Аляксандра Мілінкевіча.

ВІНШУЕМ!

Узнагарода з Украіны

У гасцях у вядомай беларускай паэткі Ніны Мацяш пабываў Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Украіны ў Беларусі Ігар Ліхавы.

Ён завітаў у кампаніі з вядомымі беларускімі пісьменнікамі Анатолем Вярцінскім, Сяргеем Законнікавым, Генадзем Пашкевічам, каб уручыць літаратару з Берасцейшчыны міжнародную літаратурна-мастацкую прэмію імя Рыгора Скаварады за пераклады твораў украінскіх паэтаў.

БУДЬТЕ ЗДОРОВЫ!

«Женского» рака больше не будет?

Министерство здравоохранения Беларуси разрешило к применению первую и единственную в мире квадривалентную вакцину (ГАРДАСИЛ компании MSD), предотвращающую развитие рака шейки матки.

Об этом сообщил профессор, доктор медицинских наук, завкафедрой акушерства и гинекологии Витебского медицинского института Сергей Занько на встрече с экспертами по предотвращению раковых заболеваний у женщин. Встреча проходила в Минске в рамках 15-й международной выставки "Здравоохранение-2008".

Вакцина ГАРДАСИЛ показана к применению детям и подросткам обоих полов в возрасте от 9 до 17 лет, а также молодым женщинам в возрасте от 18 до 26 лет для предупреждения заболеваний, вызываемых вирусом папилломы человека (ВПЧ). Среди них рак шейки матки, генитальные кондиломы и различные предраковые диспластические состояния, пояснил Сергей Занько.

Рак шейки матки занимает второе место в Европе в структуре смертности от онкологических заболеваний среди девушек и молодых женщин в возрасте от 15 до 44 лет (после рака молочной железы). По данным канцеррегистра, частота возникновения рака шейки матки в Беларуси за последние 10 лет составила 792—902 новых случаев в год, а смертность 367—543 случая в год.

"ГАРДАСИЛ поможет существенно изменить картину заболевания раком шейки матки для будущих поколений девушек и женщин Беларуси. Подобная вакцина может стать самым эффективным орудием, которое поможет не только в борьбе с этим тяжелейшим заболеванием, но и в профилактике других онкологических заболеваний у женщин, а также существенно снизить человеческие и экономические потери от тяжелейших онкологических заболеваний ", — отметил Сергей Занько.

Эффективность вакцины ГАРДАСИЛ оценивалась в четырех международных контролируемых клинических исследованиях, в которые было включено более 20 тыс. женщин в возрасте от 16 до 26 лет из 33 стран мира. Применение этой вакцины помогло предотвратить развитие рака шейки матки в 99% случаев и в 100% случаев — рака вульвы и влагалища, связанных с ВПЧ 16 и 18 типов, у тех женщин, которые ранее не были инфицированы этими типами. Препарат также продемонстрировал возможность дополнительной защиты в отношении других не охватываемых вакциной десяти типов вируса папилломы человека.

Вакцина ГАРДАСИЛ уже зарегистрирована в более чем 90 странах мира, также она включена в Национальные календари вакцинации многих государств.

ЦІКАВЫЯ ЎСПАМІНЫ

Сустрэчы з Гагарыным

12 красавіка спаўняецца чарговая гадавіна першага палёту чалавека ў космас.

Да гэтага часу сувязі Гагарына з Беларуссю і з беларусамі застаюцца мала вядомыя, пры тым што ў нашай краіне ёсць людзі, якія асабіста ведалі першага касманаўта планеты. Сёння мы друкуем успаміны аднаго з іх, Іосіфа Навумчыка, які ў 1960-я гады ўзначальваў Віцебскую абласную камсамольскую арганізацыю:

Юрый Гагарын з дэлегатамі XV з'езда ВЛКСМ.

— Упершыню я ўбачыў Гагарына ў дзень адкрыцця XIV з'езда ВЛКСМ, 16 красавіка 1962 года. Мы, дэлегаты, прыйшлі ў Крамлёўскі Палац з'ездаў дзесьці гадзіны за паўтары. Была ўзрушаная, урачыстая атмасфера, дэлегаты знаёміліся, фатаграфаваліся са знакамітымі людзьмі краіны, гучалі песні.

Большасць дэлегатаў нашай вобласці наогул былі ў Маскве ўпершыню, а тут патрапілі адразу ў Крэмль.

У цэнтры ўвагі — Юрый Гагарын і Герман Цітоў, першыя і на той час адзіныя савецкія касманаўты. Падысці да іх праз кола сотняў юнакоў і дзяўчат было няпроста. Пры адкрыцці з'езда ўносіўся сцяг ВЛКСМ, і сцяганосцам быў Юрый Гагарын. Я сядзеў у сёмым радзе ад сцэны, на другім месцы ад цэнтральнага праходу, і гэтая ўрачыстасць мяне асабліва кранула.

Абодва касманаўты былі абраныя ў прэзідыум з'езда і занялі крэслы па канцах першага рада (у цэнтры размясціліся кіраўнікі краіны на чале з Хрушчовым і Брэжневым). З першай жа гадзіны перад Гагарыным і Цітовым выраслі стосы паштовак, пісьмаў, на якіх яны ставілі свае аўтографы для дэлегатаў і гасцей.

Наша беларуская дэлегацыя жыла ў гатэлі "Масква", там жа мы снедалі, абедалі і вячэралі.

18 красавіка, на трэці дзень работы з'езда, мы з першым сакратаром Аршанскага райкама камсамола Яфімам Булынам пасля пасяджэнняў збіраліся на сустрэчу з камсамольцамі адной з маскоўскіх арганізацый — нашых шэфаў. А пакуль зайшлі перакусіць у рэстаран гатэля "Масква" на трэцім паверсе. Зала рэстарана была яшчэ амаль пустой.

Праз некалькі хвілін у залу ўвайшоў Юрый Гагарын, адзін, без суправаджэння. Ён сеў за суседні столік і замовіў піва. У нас імгненна ўзнікла ідэя запрасіць Гагарына на вячэру ў нашу віцебскую дэлегацыю. Была для гэтага і нагода: дзень нараджэння дэлегаткі з Аршанскага льнокамбіната Тамары Ішчанкі.

Мы падышлі да яго століка, павіталіся, назвалі сябе і запрасілі яго на вечар 19 красавіка ў нашу дэлегацыю. Гагарын прапанаваў нам прысесці, мы ўдакладнілі наша запрашэнне. Ён, падумаўшы, даў згоду, запісаў прозвішча імяніннікі. Сказаў, што ў яго хапае афіцыйных сустрэч, і ён быў бы рады пабыць у простай, неафіцыйнай кампаніі.

Развітаўшыся з Гагарыным, мы знайшлі першага сакратара нашага абкама камсамола Валянціна Міхельсона, расказалі яму пра домоўленасць. Назаўтра, як мне стала вядома, першы сакратар ЦК камсамола Беларусі Леў Максімаў, які таксама быў у прэзідыуме з'езда, перагаварыў з Гагарыным, ён пацвердзіў сваю згоду быць разам з віцебскай дэлегацыяй. Мы замовілі вячэру ў Мармуровай зале гатэля "Масква", а дзяўчаты з нашай віцебскай дэлегацыі пасля абеду пабеглі ў цырульні (усё ж чакалі ў госці самага знакамітага чалавека планеты!).

Але на вечаровым пасяджэнні Гагарына ў прэзідыуме не было, і гэта нас устрывожыла. Хваляванні апраўдаліся: пасля пасяджэння Максімаў сказаў нам, што Гагарын не прыйдзе, ён па плану ЦК ВЛКСМ сустракаецца з афіцыйнай замежнай дэлегацыяй. Але Гагарын перадаў Максімаву падарунак для імяніннікі. Вечарам мы ўрачыста ў прысутнасці сакратароў ЦК камсамола Беларусі адзначылі народзіны Тамары Ішчанкі, а Леў Максімаў уручыў ёй падарунак ад першага касманаўта — калье. На футляры, у якім ляжала ўпрыгажэнне, быў надпіс "Тамаре Ищенко в день 24-летия. Гагарин. 19 апреля 1962 года".

А праз чатыры гады я пазнаёміўся з Гагарыным бліжэй.

На XV з'ездзе ВЛКСМ, які адбыўся ў маі 1966 года ў тым жа Крамлёўскім Палацы з'ездаў, Юрый Гагарын і Валянціна Церашкова былі вылучаныя ў склад Цэнтральнага Камітэта камсамола. Мяне таксама прапанавалі ў члены ЦК.

На закрытым пасяджэнні з'езда зачытвалі вынікі галасавання, і яны былі для мяне нечаканасцю: супраць Гагарына прагаласавалі тры дэлегаты, а Церашковай — шэсць. Сам я атрымаў адзін голас супраць. І пазней нават даведаўся, ад каго — сакратар Гродзенскага абкама сам прызнаўся, што галасаваў супраць усіх з Беларусі, бо яго самога ў склад ЦК не ўключылі. Тады мяне здзівіла, што былі зайздроснікі ці непрыяцелі і ў Гагарына, якога, здаецца, любілі ўсе. Праўда, што азначалі гэтыя адзінкі "супраць" з больш як трох тысяч васьмісот дэлегатаў, якія прагаласавалі "за"!

Пленумы ЦК звычайна праходзілі два разы ў год у канферэнц-зале гатэля "Юность", у гэтай жа гасцініцы мы і жылі. Гэтая сціплая па цяперашніх часах гасцініца ў той час выглядала ўвасабленнем сучаснага дызайну і камфорту. Сэрвіс таксама быў на ўзроўні — я заўсёды наведваў гатэлевую цырульню, працаваў там адзін хлапец і стрыг вельмі добра. Дарэчы, і Гагарын у апошнія гады звычайна стрыгся ў яго.

Мы з Гагарыным пры сустрэчах віталіся, коратка размаўлялі, але нейкіх доўгіх гутарак "сам-насам" не было (навязвацца да яго ў "сябры" не дазваляла "беларуская сціпласць").

А вось адна з апошніх сустрэч з Гагарыным была нечакана працяглай. Адбылася яна ў час пленума ЦК у лютым 1967 года.

У перапынку пленума я затрымаўся на сваім паверсе (ліфты былі запоўненыя) і спазніўся на пасяджэнне, якое ўжо некалькі хвілін як пачалося. Заходзіць у залу, звяртаючы тым самым на сябе ўвагу ўсіх прысутных, было неяк няёмка. Вырашыў пачакаць за дзвярыма.

І тут мяне заўважыў Гагарын, які таксама на некалькі хвілін спазніўся. Юрый прапанаваў мне пайсці разам з ім у пакой адпачынку прэзідыума (сам ён быў абраны ў прэзідыум), спаслаўшыся на тое, што ў гэтым пакоі чутны прамовы, і можна спакойна пасядзець за столікам, выпіць вады, чаю ці кавы.

І мы практычна ўсё гэтае пасяджэнне, нешта больш за гадзіну, прасядзелі ўдвух за кавай (здаецца, да кавы і грамаў па дваццаць каньяку выпілі).

Успомнілі агульных знаёмых, XIV і XV з'езды камсамола. Я сказаў, як ганарыцца Тамара Ішчанка падарункам ад яго, яна ўжо была абрана другім сакратаром абкама камсамола. Юрый Гагарын прыгадаў гэту сітуацыю, дадаўшы, што вельмі шкадаваў тады, што не змог пабыць на вечары з віцебскай моладдзю.

А адносіны яго да беларусаў, сказаў Гагарын, самыя прыязныя, ды, можа, і продкі яго з беларусаў, паколькі Смаленшчына ў канцы XIX стагоддзя больш як на палову складалася з беларусаў і гаварыла па-беларуску.

На жаль, я не занатаваў тую размову — не меў такой звычкі, ды і быў перакананы, што гэтая наша гутарка з Гагарыным не апошняя. Сустрэча сапраўды была не апошняй, але паразмаўляць вось так, сам-насам, больш не давялося — у сакавіку 1968 года Гагарын загінуў...

Іосіф НАВУМЧЫК,
старшыня Віцебскага абласнога аддзялення ГА "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны".

ПЫТАННЕ — АДКАЗ

«Гэта не канец...»

Як вядома, у памяшканнях, якія здымалі радыёстанцыя Радыё "Рацыя", "Еўрапейскае радыё для Беларусі", а таксама ў журналістаў, якія супрацоўнічаюць з тэлекампаніяй "Белсат", былі праведзены масавыя вобыскі, канфіскоўвалася аргтэхніка і апаратура... А як жа зараз працуюць гэтыя СМІ?

Іван Рыбыраў,
Магілёўскі раён.

На пытанне нашага чытача адказваюць кіраўнікі адпаведных медыя.

Зміцер НОВІКАЎ, кіраўнік "Еўрапейскага радыё для Беларусі":

— Я думаю, што ў нашай працы нічога не зменіцца. Будзем працаваць, як і працавалі, у звычайным рэжыме. Натуральна, крыху ўскладніцца праца, таму што цяжэй будзе атрымліваць нейкія нармальныя, аб'ектыўныя каментарыі. Але мы былі падрыхтаваны да такога развіцця падзей.

Кастусь ВАНСЯЦКІ, супрацоўнік Радыё "Рацыя":

— Першае, што мы зробім, — гэта паспрабуем атрымаць акрэдытацыю, і тады ўлады, МЗС не будуць мець магчымасці казаць, што „да нас ніхто не звяртаўся, але мы добрыя, гатовыя ўсім даць акрэдытацыю, але як мы можам даць, калі да нас не звяртаюцца?". Вось мы і паглядзім, як яны адрэагуюць на гэта.

Аляксей ДЗІКАВІЦКІ, дырэктар інфармацыйнай службы "Белсата":

— Канал працягвае працаваць гэтак жа, як і працаваў. Аніякіх зменаў ні ў праграмах, ні ў навінах (што вельмі важна, бо для навін мы робім і атрымліваем матэрыялы з Беларусі штодня). Канечне, тая акцыя, якая была праведзена не толькі супраць нас, але і яшчэ супраць шмат якіх незалежных журналістаў, не дапамагае нам працаваць, але і не настолькі перашкаджае, каб мы павінны былі спыніць сваю працу. Так што некаторая інфармацыя, якая з'яўляецца, што, маўляў, „Белсат" не зможа працаваць, гэта ўжо канец, — яна абсалютна заўчасная.

Па інфармацыі "Народнай волі", частка журналістаў з Беларусі была выклікана ў Польшчу, і зараз яны рыхтуюць свае праграмы з суседняй краіны.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Александр ГРИГОРОВ:

«Если бы билеты были, то желающие съездить в Пекин на Олимпиаду у нас нашлись бы»

Не так давно в российских средствах массовой информации появилась новость о том, что ОАО "Аэрофлот — российские авиалинии" во время Олимпиады организует аж пять дополнительных рейсов из Москвы в Пекин. А можно ли будет из Минска улететь на Олимпиаду в Пекин?

Как сказали "Народной воле" в "Белавиа", сейчас прямого рейса в Пекин из Минска нет. И в ближайшее время вряд ли будет.

Кстати, около двух лет назад нынешний посол Беларуси в Китае Анатолий Тозик обращался к главе государства с просьбой возобновить прямой рейс Минск—Пекин "в целях активизации торгово-экономического сотрудничества Беларуси и Китая". А.Лукашенко поручил Национальной авиакомпании "Белавиа".изучить целесообразность данного вопроса.

"Если это выгодно белорусским предприятиям-экспортерам, вопрос нужно решать положительно", — сказал глава государства в 2006 году на одном из совещаний с руководителями загранучреждений нашей страны.

Выходит, кто-то решил, что для Беларуси этот рейс невыгодный?

Министр спорта и туризма Беларуси Александр Григоров считает, что если бы был прямой рейс из Минска в Пекин, то наверняка бы нашлись желающие слетать на Олимпиаду.

"Однако не Министерство спорта решает целесообразность создания таких рейсов, — сказал Александр Владимирович. — Это "Белавиа" должна организовывать, подсчитать какую-то коммерческую составляющую таких полетов. Но, думаю, если бы билеты были, то желающие съездить в Пекин на Олимпиаду у нас нашлись бы. Да и просто туристов хватает..."

Ольга ПРУДНИКОВА.

НАРОДНОЕ МНЕНИЕ

Свое мнение по поводу открытия рейса Минск—Пекин высказали и читатели сайта "Народной воли" www.nv-online.info.

"Высказывающихся не волнует, что для выполнения данного рейса необходимо приобрести несколько дальнемагистральных самолетов по сумасшедшим ценам, — пишет некто "Авиатор". — *Кроме того, данные самолеты рассчитаны на перевозку 220 и более пассажиров. Стоимость рейса большая. Поэтому надо загружать рейс на 70—80%. Самолет зарабатывает деньги только тогда, когда летает, т.е. надо, чтобы он летал постоянно. Не может он 1 раз в неделю выполнить рейс и потом неделю сидеть на земле..."*

АКТУАЛЬНА

Чаму старасць без радасці?

Ці можа старасць быць з радасцю?

— Так, можа, — лічыць вядомы ўрач-герыятр Віцебскай вобласці Наталля Лугаўцова. — Трэба толькі рэгулярна рабіць ранішнюю гімнастыку і мець не менш як чацвёра дзяцей, каб па чарзе гасцяваць у кожнага з іх. Праўда, Беларусь у гэтым сэнсе ўжо саступае іншым краінам. Мы не можам пахваліцца працягласцю жыцця жанчын. Тут першыя тры месцы займаюць Японія, Швецыя і Ганконг.

— У Японіі, — засведчыла Н.Лугаўцова, — жанчыны жывуць у сярэднім 82 гады, а ў Беларусі цяпер чакаемая працягласць жыцця прадстаўніц прыгожага полу — 75 год.

Статыстыка сведчыць, што тэмпы старэння насельніцтва Віцебшчыны імкліва нарастаюць. З 1999 года жыхароў вобласці стала менш на 7%. Колькасць старых людзей за гэты час паменела на 4,4%, што сведчыць пра высокі ўзровень смяротнасці сярод моладзі і людзей сярэдняга ўзросту, якія маглі б нараджаць дзяцей. З гэтай статыстыкі вынікае, што большасці нашых жанчын наканавана не дажыць да глыбокай старасці, а па-другое, у іх няма надзеі пацешыцца ўнукамі і праўнукамі, бо іх няма каму нараджаць і гадаваць.

Сяргей БУТКЕВІЧ.

ПАСЛУГІ

Прыём шклатары і іншая дапамога жадаючым.
Тэл. (8-033) 661-11-87 (МТС).

На тэрыторыі Бабруйскай крэпасці з'явіцца жаночы манастыр

Ён размесціцца ў будынках, дзе калісьці знаходзіліся ваенныя казармы. На гэты час ужо прызначана ігумення, на наступным тыдні сюды прыедуць і сёстры.

Пакуль іх будзе толькі чатыры, аднак пасля рэканструкцыі манастыр зможа прыняць больш за сотню манашак. Тэрыторыю крэпасці для размяшчэння манастыра выбралі невыпадкова. Менавіта ў гэтым месцы калісьці знаходзіўся Аляксандра-Неўскі сабор. Яго таксама збіраюцца аднавіць.

SOS!

У Беларусі гінуць дрэвы

У Беларусі прадаўжаецца тэндэнцыя ўсыхання дрэў каштоўных цвёрдаліставых парод, напрыклад, дуба і ясеня, паведаміў міністр лясной гаспадаркі Пётр Сямашка на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Паводле яго слоў, гэта адбываецца апошнія 10—15 гадоў.

Вучоныя называюць некалькі прычын гібелі дрэў: паніжэнне ўзроўню грунтовых вод, глабальнае пацяпленне, а таксама трапляннe гербіцыдаў у грунтовыя воды, якія "атручваюць" карані раслін.

Наталля КАРОТКАЯ.

КОРАТКА

У беларускіх школах з 1 верасня з'явіцца ўрок футбола

У новым навучальным годзе ў беларускіх школах з'явіцца дадатковы ўрок — "Гадзіна футбола". Пра гэта паведаміў старшыня Беларускай федэрацыі футбола Генадзь Нявыглас.

Урокі будуць праходзіць па суботах як для хлопчыкаў, так і для дзяўчынак. Акрамя таго, будуць адраджацца школьныя футбольныя секцыі і спецыялізаваныя футбольныя класы.

Хлопчык у садзе бомбу знайшоў

У вёсцы Рассвет Акцябрскага раёна вучань трэцяга класа прынёс дамоў артылерыйскі снарад, які знайшоў на прысядзібным участку.

Як паведаміў БелаПАН прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Руслан Габрылёў, бацькі хлопчыка выклікалі ўчастковага інспектара міліцыі. Той аднёс снарад на свой прысядзібны ўчастак, а потым выклікаў прадстаўнікоў МНС і групу размініравання.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 9.04.2008 у 16.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №